№ 23 (525) 22 чэрвеня 2007 www.nn.by

# Наша Ніва

ПЕРШАЯ БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЭТА

ISSN 1819-1614

Заснаваная ў лістападзе1906. АднОўленая ў траўні 1991. Выдавец: Прыватнае прадпрыемства «Суродзічы». Выходзіць штотыднёва, у пятніцы



# МАЛАЯ КАНСТЫТУЦЫЯ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСІ

## Канстытуцыйны закон Рэспублікі Беларусі «Аб сыстэме і паўнамоцтвах органаў дзяржаўнай улады, а таксама органаў мясцовага самакіраваньня»

(праект)

МЕНСК
2007

Дэмакратычная апазыцыя падрыхтавала праект Малой Канстытуцыі на пераходны пэрыяд. Галоўныя зьмены датычаць выбарчага заканадаўства, падзелу функцый між галінамі ўлады. Яны адпавядаюць практыцы эўрапейскіх краінаў. Прапануем гэты дакумэнт увазе грамадзкасьці. Старонка 3.

## У НУМАРЫ

**Мілінкевіч дае шанец**

Рэгістрацыя Руху «За свабоду» як індыкатар дэмакратызацыі краіны. **Старонка 9.**

**Дзень Быкава**

Рэпартажы зь Менску і з Бычкоў. **Старонка 11.**

**Сідорскі заявіў аб правале замежнагандлёвых паказчыкаў**

...які абясцэніў іншыя дасягненьні эканомікі за студзень-травень. **Старонка 12.**

**Што мяняць спачатку: начальства ці сьцяг?**

Такая спрэчка ўсчалася між беларусамі й літоўцамі падчас сумеснай вандроўкі па Вяльлі, па сьлядох экспэдыцыі графа К.Тышкевіча. **Старонка 16.**



# У нумары

## люстра дзён

Дэмарш Мандэльсона ................9
Мілінкевіч дае шанец ......................9
Прэмія Ластоўскага матэматыку, мэдыку і кліматолягу ................9
Бывай, Сэвэрын........ 10
Дзень Быкава ........... 11
Сьціслы: Міндукацыі хоча вярнуць мову ў ВНУ, «Рэспубліка» прабачылася перад каталікамі, новы пасол Вялікай Брытаніі, парлямэнт захаваў разьмеркаваньне 10

## гаспадарка

Дажынкі пад пагрозай ............. 12
Прэм'ер міністар заявіў аб правале замежнагандлёвых паказчыкаў ................. 12
Цягам году мусяць прыватызаваць цэмэнтныя заводы ......................... 12

## хроніка

Малітва за права малітвы, Казуліна пазбавілі сустрэчы зь сям'ёй, Дашкевіч адсядзеў палову тэрміну... 13

## камэнтары

Аляксандар Класкоўскі. Працьверазеньне ........9
Аляксандар Класкоўскі. Скасавалі мёртваму прыпаркі ...................... 10
Віталь Тарас. Капітальны рамонт .. 14

## культура

Што мяняць спачатку: мову ці сьцяг? ........... 16
Які твор беларускай літаратуры варта экранізаваць? ............. 18
Дзядзька Антось зноў у Вільні ............. 20

## мы самі

Дзякуй ........................ 17

## аб усім патроху

Бясплатныя візы ў Літву застануцца, Загінуў самы знакаміты альпініст Беларусі, Новыя правілы ўвозу грошай у ЭЗ, Беларускі Ракфэлер... ................. 21

## дыскаграфія

N.R.M., «beZ bileta», «Атлянтыка» ............. 29

## дзе варта быць

Будслаўскі фэст, Купальле, Беларускі фэстываль у ЗША, «Жыгімонт Ваза», кінафармат «4×4» .... 30

**КАМЭНТАР РЭДАКЦЫІ**

# Парушэньне абмену рэчываў

Дыпляматыя апазыцыі можа і павінна змагацца за вяртаньне прэфэрэнцый. Камэнтар Рэдакцыі.

Рашэньне прынятае. Беларусь пазбылася прэфэрэнцый у гандлі з Эўрасаюзам.

Гэта азначае, што ЭС ня лічыць пагрозу далучэньня Беларусі да Расеі рэальнай. Ён ня бачыць бяды ў дадатковай пераарыентацыі беларускіх гандлёвых патокаў на Расею.

Эўрасаюз верыць у мэтазгоднасьць мэтаду санкцый. ЭС лічыць магчымым зьмяніць уладу ў Беларусі і не выключае хуткай дэстабілізацыі эканамічнай сытуацыі. Пры гэтым ЭС прыйшоў да разуменьня, што лукашэнкаўцы рэагуюць толькі на фінансавыя аргумэнты. І мяркуе, што Лукашэнка ня будзе бясконца павялічваць сваю залежнасьць ад Масквы. Міжнароднае прафсаюзнае і праваабарончае лобі ўплывае на Брусэль у пытаньні Беларусі ў большай ступені, чым у пытаньні, скажам, Узбэкістану, што тлумачыцца меншым уплывам бізнэс?групаў, у Беларусі непрысутных.

Санкцыі — гэта матэрыялізаванае непрыманьне эўрапейцамі самае натуры беларускага рэжыму. Як сказаў пасол Бэнэт, яны хутчэй з плоскасьці псыхалягічнай, а не практычнай.

Расея кіравалася зусім іншымі матывамі, касуючы свае гандлёвыя прэфэрэнцыі з пачатку гэтага году. Дамову аб зьняцьці бар'ераў у гандлі лабіравалі якраз прамысловыя групы. Пры гэтым у знак падтрымкі палітычнага курсу Масква захавала істотныя энэргетычныя прэфэрэнцыі, узамен за «Белтрансгаз».

Непасрэдныя эканамічныя страты ад рашэньня ЭС будуць невялікімі. Закрануты беларускі экспарт у памеры прыкладна 400 млн эўра, дык страты дзяржаўнага бюджэту, імаверна, не перавысяць 10—20 % ад гэтай сумы. Гэта не сьмяротна. Такія неістотнасьці не дадуць імгненны палітычны эфэкт. Аднак яны, нібы, парушэньне абмену рэчываў, будуць уплываць на арганізм беларускай эканомікі. Калі парушэньне акажацца зацяжным, ягоны эфэкт будзе выключна нэгатыўным.

Беларусь мае патрэбу ў эўрапейскім рынку, прычым ня толькі для нафтапрадуктаў, а ўсё больш для хіміі, харчовых прадуктаў, тэкстылю. Між тым без прэфэрэнцый мы будзем заўжды прайграваць канкурэнтам з суседніх краінаў. Санкцыі адштурхоўваюць Беларусь ад эўрапейскага рынку, а эўрапейскіх інвэстараў — ад Беларусі.

У нацыянальных інтарэсах Беларусі — змагацца за вяртаньне прэфэрэнцый. Дыпляматыя апазыцыі можа і павінна падключыцца да вырашэньня гэтай задачы. У гэтым бачыцца палітычны шанец для яе.

# Малая Канстытуцыя

Малая Канстытуцыя — гэта дакумэнт, які дзейнічае ў пераходныя пэрыяды. Напрыклад, у часе пераходу краіны ад дыктатуры да цывілізаванага грамадзкага ладу. У Польшчы было аж тры такія Канстытуцыі, паводле Малой Канстытуцыі жыве зараз Ізраіль. Для Беларусі гэткую «Канстытуцыю на вырост» прыняў 26—27 траўня Кангрэс дэмакратычных сілаў.

Распрацавала яе група экспэртаў у галіне канстытуцыйнага права. Сярод іх быў і былы сьпікер Вярхоўнага Савету Мечыслаў Грыб, пад чыёй рэдакцыяй прымалася першая Канстуцыя Рэспублікі Беларусі 1994 г.

«Малой» Канстытуцыя завецца, бо няпоўная. Там няма разьдзелаў «вялікай» Канстытуцыі, якія, на думку распрацоўшчыкаў, адпавядаюць нормам міжнароднага права. Зьмены закранулі выбарчае заканадаўства, разьмежаваньне функцыяў між галінамі улады. Чым яшчэ Малая Канстытуцыя розьніцца ад дзейнай? Адказваюць складальнікі.

## Парлямэнт: Рада замест Савету; адна палата; 50% па партыйных сьпісах; цяжэй «адставіць»

**Мечыслаў Грыб, былы сьпікер Вярхоўнага савету (1994—96):** «У параўнаньні зь сёньняшняй Канстытуцыяй унесены істотныя зьмены ў пытаньні дзяржаўнага будаўніцтва. Павялічваюцца правы ўраду і парлямэнту. Парлямэнт будзе называцца Вярхоўная Рада, як ва ўкраінцаў. Разглядаўся варыянт наконт Вышэйшага сойму, аднак быў адкінуты.

Таксама мы заклалі ў Малую Канстытуцыю новы падыход да фармаваньня парлямэнту. Цяпер выбары будуць праходзіць па мажарытарна-прапарцыйнай сыстэме. 50% дэпутатаў будуць абірацца па мажарытарнай сыстэме, а другая палова — па партыйных сьпісах. Зрабіць адразу прапарцыйную сыстэму немагчыма: у частцы беларускіх рэгіёнаў няма адпаведных партыйных структураў.

Прэзыдэнту будзе цяжэй адправіць у адстаўку парлямэнт. Напрыклад, калі ён уносіць на галасаваньне ў Раду кандыдатуру прэм’ер-міністра, парлямэнт можа адхіліць яе двойчы. Пасьля Рада мусіць унесьці сваю кандыдатуру, калі і яе не зацьвердзяць, прэзыдэнт можа адправіць парлямэнт у адстаўку.

Быў варыянт і наконт таго, што Беларусь мусіць стаць парлямэнцкай рэспублікай, але мы палічылі, на пераходным этапе пасада прэзыдэнта неабходная.

## Урад: справаздачнасьць перад Радай; канстытуцыйны кантроль замест «вэртыкалі»

**Валеры Фадзееў, былы намесьнік старшыні Канстытуцыйнага суду:** «Савет міністраў мусіць быць найвышэйшым органам дзяржаўнай улады ў краіне, так закладзена і ў Малой Канстытуцыі. Саўмін будзе рабіць справаздачы па зробленай працы перад парлямэнтам. Прызначаць прэм’ера будзе парлямэнт па прапанове прэзыдэнта. Астатні кабінэт будзе прапаноўвацца прэм’ерам.

У Малую Канстытуцыю ўнесенае і пытаньне недаверу да ўраду. Калі парлямэнт вырашаў, што ўрад ня справіўся з праграмай цалкам ці з асобным пытаньнем (скажам, бюджэту), парлямэнт мае права адправіць урад у адстаўку.

У Малой Канстытуцыі мы адмовіліся ад прэзыдэнцкай вэртыкалі, якая існуе сёньня ў Беларусі. Праўда, будзе пасада ўпаўнаважанага ад ураду ва ўсіх тэрытарыяльных адзінках краіны. Ён ня будзе ўмешвацца ў справы мясцовай улады, а толькі сачыць за выкананьнем канстытуцыйных нормаў».

## Прэзыдэнт: застаецца; не прымае дэкрэты; не прызначае чыноўнікаў; кансалідуе грамадзтва

**Гары Паганяйла, праваабаронца:** «Паўнамоцтвы прэзыдэнта істотна паменшаныя. Асабліва абмежаваньні тычацца заканадаўчай улады, яе прэзыдэнт пазбавіцца цалкам. Разам з тым застанецца фігурай знакавай у палітычным жыцьці. Напрыклад, ён будзе галоўнакамандуючым войскаў. Рашэньні наконт прызначэньня вышэйшага чынавенства прэзыдэнт прымаць ня будзе. Сёньня ж прэзыдэнт прымае 98% такіх рашэньняў.

Гістарычны досьвед суседніх краінаў падказвае, што цалкам адмаўляцца ад пасады прэзыдэнта немэтазгодна. Прэзыдэнт мусіць заставацца кансалідуючай сілай у грамадзтве. Найбольш падыходзячай формай кіраваньня для Беларусі зьяўляецца парлямэнцка-прэзыдэнцкая рэспубліка. Яе асновы і былі закладзеныя ў Малую Канстытуцыю».

## Выбары і мясцовая ўлада: меншыя акругі; меней подпісаў за рэфэрэндум; скасаваньне раёнаў; самастойнасьць мясцовых саветаў

**Сяргей Альфер, юрыст:** «У парлямэнце будзе 260 чалавек, больш чым цяпер. Паменшацца выбарчыя акругі, сёньня ў акрузе 60—70 тыс. выбарцаў, мы прапануем — 50—55. Прэзыдэнцкія выбары застануцца ўсеагульнымі. Мы лічым, што выбарчыя камісіі павінны збольшага складацца з прадстаўнікоў палітычных суб’ектаў, якія сёньня проста ня могуць трапіць у камісіі.

Сёньня фактычна толькі адзін суб’ект можа абвяшчаць рэфэрэндум — прэзыдэнт. Паводле Канстытуцыі, таксама можа парлямэнт і народ, але прэзыдэнт у стане ня даць дазволу на яго правядзеньне. Паводле Малой Канстытуцыі прэзыдэнт увогуле ня можа абвяшчаць рэфэрэндум. Гэта ў стане зрабіць толькі Вярхоўная Рада і народ. Апошняму суб’екту, каб абвесьціць рэфэрэндум, трэба сабраць мінімум 30 тыс. подпісаў у кожнай вобласьці, а таксама ў Менску. Лічба зьніжаная практычна ў два разы, сёньня патрабуюць 450 тыс. подпісаў.

Адна з галоўных асаблівасьцяў Малой Канстытуцыі — узрастаньне ролі мясцовага самакіраваньня. Гэта наблізіць Беларусь да дэмакратычных краінаў. Самакіраваньне прадугледжваецца двухзьвяновае, а не трохзьвяновае (сельскія, гарадзкія, абласныя выканкамы), як сёньня. Дакладна застанецца абласны ўзровень, які будзе другі, пакуль ня вырашана. Мясцовыя саветы будуць мець свае прыбыткі, якія ня зможа забіраць дзяржава. Неабходна прызямліць мясцовую ўладу, якая цяпер залежыць толькі ад вышэйшага начальства, а не ад выбарцаў, якія за яе галасуюць».

## Суды і кантрольныя органы: прэзыдэнт нікога не прызначае; трыбунал; міравыя суды; назіральная рада па тэле- і радыёвяшчаньню

**Міхаіл Пастухоў, былы сябар Канстытуцыйнага суду:** «Судовая ўлада ў Беларусі мае быць незалежнай і самас-

Працяг на старонцы 8.

# Канстытуцыйны закон Рэспублікі Беларусі «Аб сыстэме і паўнамоцтвах органаў дзяржаўнай улады, а таксама органаў мясцовага самакіраваньня» (Малая Канстытуцыя Рэспублікі Беларусі)

*праект*

**Дадзены Канстытуцыйны закон аб сыстэме і паўнамоцтвах органаў дзяржаўнай улады, а таксама органаў мясцовага самакіраваньня, далей «Малая Канстытуцыя», прымаецца ў мэтах выйсьця беларускай дзяржавы і грамадства з зацяжнога канстытуцыйнага крызісу, забесьпячэньня ў краіне канстытуцыйнай законнасьці, праў и свабод чалавека і грамадзяніна.**
**Рэспубліка Беларусь прызнае, выконвае і забясьпечвае агульнапрызнаныя правы і свабоды чалавека, замацаваныя ў Канстытуцыі і законах, а таксама прадугледжаныя яе міжнароднымі абавязальніцтвамі.**
**Міжнародныя дамовы, ратыфікаваныя Рэспублікай Беларусь, зьяўляюцца складовай часткай нацыянальнага заканадаўства і выкарыстоўваюцца ўсімі дзяржаўнымі органамі і службовымі асобамі як непасрэдна дзеючае права.**
**Малая Канстытуцыя носіць часовы характар і дзейнічае аж да прыняцьця новай Канстытуцыі Рэспублікі Беларусі.**

## РАЗЬДЗЕЛ І. ВЫБАРЧАЯ СЫСТЭМА. РЭФЭРЭНДУМ*

### Частка 1. ВЫБАРЧАЯ СЫСТЭМА

**Артыкул 1.** Выбары дэпутатаў і іншых асоб, якія выбіраюцца на дзяржаўныя пасады, а таксама на пасады ў органах мясцовага самакіраваньня народам, зьяўляюцца ўсеагульнымі: права абіраць маюць грамадзяне Рэспублікі Беларусі, якія дасягнулі 18 гадоў.
У выбарах ня ўдзельнічаюць грамадзяне, прызнаныя судом недзеяздольнымі. Любое непасрэднае або ўскоснае абмежаваньне выбарчых правоў грамадзян у іншых выпадках зьяўляецца недапушчальным і караецца згодна з законам.
Узроставы цэнз дэпутатаў і іншых асоб, якія выбіраюцца на дзяржаўныя пасады, вызначаецца адпаведнымі законамі, калі іншае не прадугледжана Канстытуцыяй.

**Артыкул 2.** Выбары зьяўляюцца свабоднымі: выбаршчык асабіста вырашае, ці ўдзельнічаць яму ў выбарах і за каго галасаваць.
Ніхто ня мае права ўплываць на выбаршчыка з мэтай прымусіць яго рознымі спосабамі да ўдзелу або няўдзелу ў выбарах, а таксама на яго волевыяўленьне.
Падрыхтоўка і правядзеньне выбараў праводзяцца адкрыта і галосна.

**Артыкул 3.** Выбары зьяўляюцца роўнымі: выбаршчыкі маюць роўную колькасьць галасоў.
Колькасьць выбаршчыкаў у кожнай выбарчай акрузе для выбраньня аднаго дэпутата пры кожным відзе выбараў ня можа адрозьнівацца больш чым на 10 працэнтаў.
Кандыдаты, якія выбіраюцца на дзяржаўныя пасады, а таксама на пасады ў органах мясцовага самакіраваньня, удзельнічаюць у выбарах на роўных падставах.

**Артыкул 4.** Выбары Прэзыдэнта Рэспублікі Беларусі, дэпутатаў Вярхоўнай рады Рэспублікі Беларусі, дэпутатаў прадстаўнічых органаў і службовых асоб мясцовага самакіраваньня зьяўляюцца простымі — яны выбіраюцца грамадзянамі непасрэдна.

**Артыкул 5.** Галасаваньне на выбарах зьяўляецца тайным: кантроль за волевыяўленьнем выбаршчыкаў у ходзе галасаваньня забараняецца.

**Артыкул 6.** Права вылучэньня кандыдатаў у дэпутаты належыць палітычным партыям, выбарчым блёкам (саюзам) палітычных партый, а таксама грамадзянам у парадку, устаноўленым законам.

**Артыкул 8.** Правядзеньне выбараў, судзеяньне ў рэалізацыі выбарчых праў грамадзян, кантроль за іх выкананьнем забясьпечваюць выбарчыя камісіі.
Цэнтральная выбарчая камісія зьяўляецца стала дзеючым органам дзяржаўнай улады, які ажыцьцяўляе падрыхтоўку і правядзеньне выбараў і рэфэрэндумаў у Рэспубліцы Беларусі ў адпаведнасьці з кампэтэнцыяй, устаноўленай законам.
Цэнтральная выбарчая камісія фарміруецца з прадстаўнікоў палітычных партый, выбарчых блёкаў (саюзаў) палітычных партый, якія атрымалі прадстаўніцтва ў Вярхоўнай радзе па выніках галасаваньня па прапарцыйнай сыстэме. Акрамя таго, у склад Цэнтральнай выбарчай камісіі ў парадку, устаноўленым законам, таксама дэлегуецца па адным прадстаўніку ад абласьцей і гораду Менску.
Іншыя выбарчыя камісіі фарміруюцца ў парадку, устаноўленым законам.
Рашэньні выбарчых камісій, якія парушаюць выбарчыя правы грамадзян, могуць быць абскарджаныя ў судовым парадку.

### Частка 2. РЭФЭРЭНДУМ (НАРОДНАЕ ГАЛАСАВАНЬНЕ)

**Артыкул 12.** На рэспубліканскі рэфэрэндум не выносяцца пытаньні, зьвязаныя з магчымым парушэньнем тэрытарыяльнай цэласнасьці і сувэрэнітэту Рэспублікі Беларусі; са зьмяненьнем парадку і тэрмінаў абраньня Прэзыдэнта Рэспублікі Беларусі, дэпутатаў Вярхоўнай рады, судзьдзяў.
На рэспубліканскі рэфэрэндум таксама не выносяцца іншыя пытаньні, устаноўленыя законам.

**Артыкул 14.** Рэспубліканскія рэфэрэндумы прызначаюцца рашэньнем Вярхоўнай рады, прынятым большасьцю ня менш як у дзьве трэці галасоў ад ліку абраных дэпутатаў.
Прапанову аб правядзеньні рэспубліканскага рэфэрэндуму маюць права ўносіць дэпутаты Вярхоўнай рады ў колькасьці ня меней за 60 чалавек або ня менш за 300 тыс. грамадзян, якія валодаюць выбарчым правам, у т.л. ня менш як 30 тыс. грамадзян ад кожнай з абласьцей і гораду Менску.

**Артыкул 16.** Рашэньні, прынятыя рэспубліканскім рэфэрэндумам, падпісваюцца Прэзыдэнтам Рэспублікі Беларусі.

**Артыкул 17.** Мясцовыя рэфэрэндумы прызначаюцца адпаведнымі прадстаўнічымі органамі мясцовага самакіраваньня па сваёй ініцыятыве або па прапанове ня менш як 10 працэнтаў грамадзян, якія валодаюць выбарчым правам і пражываюць на адпаведнай тэрыторыі.

## РАЗДЗЕЛ 2. ПРЭЗЫДЭНТ, ПАРЛЯМЭНТ, УРАД, СУД

### Частка 3. ПРЭЗЫДЭНТ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСІ

**Артыкул 19.** Прэзыдэнт Рэспублікі Беларусі зьяўляецца Кіраўніком дзяржавы.
Прэзыдэнт прадстаўляе Рэспубліку Беларусь у зносінах зь іншымі дзяржавамі і міжнароднымі арганізацыямі.
Прэзыдэнт арганізуе ўзаемадзеяньне органаў дзяржаўнай улады, а таксама органаў дзяржаўнай улады і мясцовага самакіраваньня.
Прэзыдэнт зьяўляецца Вярхоўным галоўнакамандуючым Узброенымі сіламі Рэспублікі Беларусі і ў парадку, вызначаным Канстытуцыяй і законамі, прымае меры па ахове сувэрэнітэту Рэспублікі Беларусі, яе нацыянальнай бясьпекі і тэрытарыяльнай цэласнасьці. У мірны час Прэзыдэнт Рэспублікі Беларусі кіруе Ўзброенымі сіламі празь міністра абароны.
Прэзыдэнт валодае недатыкальнасьцю на час выкананьня паўнамоцтваў.

**Артыкул 20.** Прэзыдэнтам можа быць абраны грамадзянін Рэспублікі Беларусі не маладзейшы за 40 гадоў, які валодае выбарчым правам і стала пражывае ў Рэспубліцы Беларусі ня менш за дзесяць гадоў непасрэдна перад выбарамі.

**Артыкул 21.** Прэзыдэнт выбіраецца на пяць гадоў непасрэдна народам Рэспублікі Беларусі. Адна і тая ж асоба ня можа быць Прэзыдэнтам больш за два тэрміны.
Кандыдаты на пасаду Прэзыдэнта вылучаюцца грамадзянамі Рэспублікі Беларусі шляхам збору ня менш за 100 тысяч подпісаў выбаршчыкаў.
Выбары Прэзыдэнта прызначаюцца Вярхоўнай радай не пазьней чым за пяць месяцаў і праводзяцца не пазьней чым за два месяцы да заканчэньня тэрміну паўнамоцтваў папярэдняга Прэзыдэнта.
Калі пасада Прэзыдэнта аказалася вакантнай, выбары павінны быць праведзены на працягу трох месяцаў з дня адкрыцьця вакансіі.

**Артыкул 23.** Прэзыдэнт заступае на пасаду пасьля прынясеньня Пры-

* — Тэкст падаецца ў скароце.

сягі наступнага зьместу:
«Заступаючы на пасаду Прэзыдэнта Рэспублікі Беларусі, урачыста клянуся верна служыць народу Рэспублікі Беларусі, паважаць і ахоўваць правы і свабоды чалавека і грамадзяніна, выконваць і абараняць Канстытуцыю Рэспублікі Беларусі, сьвята і добрасумленна выконваць ускладзеныя на мяне высокія абавязкі».
Прысяга прыносіцца ва ўрачыстай абстаноўцы ў прысутнасьці дэпутатаў Вярхоўнай рады, судзьдзяў Канстытуцыйнага трыбунала, Вярхоўнага суду, Вышэйшага гаспадарчага суду, Вышэйшага адміністратыўнага суду і не пазьней за два месяцы з дня абраньня Прэзыдэнта. З моманту прынясеньня Прысягі нававыбраным Прэзыдэнтам паўнамоцтвы папярэдняга Прэзыдэнта спыняюцца.

**Артыкул 24.** Прэзыдэнт Рэспублікі Беларусь:
1) вядзе перамовы, падпісвае міжнародныя дамовы Рэспублікі Беларусі;
2) па прадстаўленьні Ўраду прызначае і адклікае дыпляматычных прадстаўнікоў Рэспублікі Беларусі ў замежных дзяржавах і пры міжнародных арганізацыях, прымае даверчыя і адзыўныя граматы дыпляматычных прадстаўнікоў замежных дзяржаў і міжнародных арганізацый, надае вышэйшыя дыпляматычныя рангі і спэцыяльныя званьні;
3) прызначае выбары ў Вярхоўную раду;
4) прымае рашэньне аб датэрміновым спыненьні паўнамоцтваў Вярхоўнай рады ў выпадках, прадугледжаных Канстытуцыяй;
5) прадстаўляе Вярхоўнай радзе кандыдатуру Прэм'ер-міністра;
6) прадстаўляе Вярхоўнай радзе кандыдатуры на пасаду Старшыні Вярхоўнага суду, Старшыні Вышэйшага гаспадарчага суду, Старшыні Вышэйшага адміністратыўнага суду, Старшыні Канстытуцыйнага трыбуналу, Генэральнага пракурора, Старшыні Праўленьня Нацыянальнага банку;
7) па прадстаўленьні органаў судовага самакіраваньня прызначае судзьдзяў ніжэйшых судоў Рэспублікі Беларусі і вызваляе іх ад пасады, за выключэньнем міравых судзьдзяў;
8) па прадстаўленьні Ўраду ў выпадку стыхійнага бедзтва, катастрофы, а таксама беспарадкаў, якія суправаджаюцца гвалтам ці пагрозай гвалту з боку групы асоб і арганізацый, у выніку якіх узьнікае небясьпека жыцьцю і здароўю людзей, тэрытарыяльнай цэласнасьці і існаваньню дзяржавы, уводзіць на тэрыторыі Рэспублікі Беларусі або ў асобных яе мясцовасьцях надзвычайнае становішча з унясеньнем у трохдзённы тэрмін прынятага рашэньня на разгляд Вярхоўнай рады;
9) уводзіць на тэрыторыі Рэспублікі Беларусі у выпадку ваеннай пагрозы або нападу ваеннае становішча, абвяшчае поўную або частковую мабілізацыю з унясеньнем у трохдзённы тэрмін прынятага рашэньня на разгляд Вярхоўнай рады;
10) штогод зьвяртаецца з Пасланьнем да Вярхоўнай рады аб становішчы ў дзяржаве;
11) падпісвае законы Рэспублікі Беларусі і рашэньні рэспубліканскіх рэфэрэндумаў;
12) у парадку, устаноўленым Канстытуцыяй, мае права вяртаць закон са сваімі пярэчаньнямі ў Вярхоўную раду;
13) валодае правам заканадаўчай ініцыятывы;
14) вырашае пытаньні аб прыёме ў грамадзянства Рэспублікі Беларусь і яго спыненьні, а таксама аб прадстаўленьні прытулку;
15) па прадстаўленьні Ўраду ўзнагароджвае дзяржаўнымі ўзнагародамі, надае клясныя чыны, званьні;
16) па прадстаўленьні Ўраду надае вышэйшыя воінскія званьні;
17) ажыцьцяўляе памілаваньне асуджаных;
18) фарміруе Канцылярыю Прэзыдэнта, якая забясьпечвае яго дзейнасьць;
19) утварае, рэарганізуе і ліквідуе Раду бясьпекі, а таксама іншыя кансультатыўна-дарадчыя органы пры Прэзыдэнце;
20) прызначае прадстаўніка Прэзыдэнта ў Вярхоўнай радзе і іншых службовых асоб, пасады якіх вызначаюцца законам.

**Артыкул 25.** Прэзыдэнт для рэалізацыі сваіх паўнамоцтваў на аснове і ў адпаведнасьці з Канстытуцыяй і законамі выдае ўказы і распараджэньні, якія маюць абавязковую сілу на ўсёй тэрыторыі Рэспублікі Беларусі.
Указы і распараджэньні Прэзыдэнта не павінны супярэчыць Канстытуцыі і законам Рэспублікі Беларусі.

**Артыкул 27.** Прэзыдэнт можа ў любы час падаць у адстаўку. Адстаўка Прэзыдэнта прымаецца Вярхоўнай радай.

**Артыкул 28.** Прэзыдэнт можа быць датэрмінова вызвалены ад пасады пры ўстойлівай няздольнасьці па стане здароўя выконваць свае абавязкі. Рашэньне аб датэрміновым вызваленьні Прэзыдэнта ад пасады прымаецца большасьцю ня менш за дзьве траціны галасоў ад ліку абраных дэпутатаў Вярхоўнай рады на падставе заключэньня спэцыяльна створанай камісіі.
Прэзыдэнт можа быць зьняты з пасады ў выпадку парушэньня Канстытуцыі Рэспублікі Беларусі. Пытаньне аб зьняцьці Прэзыдэнта з пасады можа быць пастаўлена на прапанову ня менш як аднай траціны ад ліку абраных дэпутатаў Вярхоўнай рады. Заключэньне аб факце парушэньня Прэзыдэнтам Канстытуцыі даецца Канстытуцыйным трыбуналам.
Рашэньне аб зьняцьці Прэзыдэнта з пасады прымаецца большасьцю ня менш як у дзьве траціны галасоў ад ліку абраных дэпутатаў Вярхоўнай рады на падставе заключэньня Канстытуцыйнага трыбуналу, які пацьвярджае факт парушэньня Прэзыдэнтам Канстытуцыі.
Прэзыдэнт можа быць адхілены ад пасады ў сувязі са зьдзяйсьненьнем дзяржаўнай здрады або іншага цяжкага злачынства. Рашэньне аб вынясеньні абвінавачаньня і яго расьсьледаваньні прымаецца на прапанову ня менш за адну траціну ад ліку абраных дэпутатаў Вярхоўнай рады, калі за яго прагаласавала ня менш за дзьве траціны ад ліку абраных дэпутатаў Вярхоўнай рады. Расьсьледаваньне па вынесеным абвінавачаньні ва ўстаноўленыя тэрміны праводзіць спэцыяльны пракурор, прызначаны Вярхоўнай радай.
Па заканчэньні расьсьледаваньня спэцыяльны пракурор прадстаўляе Вярхоўнай радзе абвінавачае заключэньне ў дачыненьні Прэзыдэнта або пастанову аб спыненьні расьсьледаваньня на падставах, устаноўленых законам. У выпадку прадстаўленьня абвінавачага заключэньня Вярхоўная рада большасьцю ў дзьве траціны галасоў ад ліку абраных дэпутатаў Вярхоўнай рады прымае рашэньне аб адхіленьні Прэзыдэнта ад пасады.
На час расьсьледаваньня, падрыхтоўкі абвінавачага заключэньня Вярхоўная рада большасьцю галасоў ад ліку абраных дэпутатаў часова адхіляе Прэзыдэнта ад пасады.
Непрыняцьце Вярхоўнай радай рашэньня аб адхіленьні Прэзыдэнта ад пасады на працягу месяца з дня паступленьня абвінавачага заключэньня спэцыяльнага пракурора азначае спыненьне працэдуры па адхіленьні Прэзыдэнта ад пасады. Паўторнае ўзбуджэньне працэдуры па адхіленьні Прэзыдэнта ад пасады на тых жа падставах не дапускаецца.

**Артыкул 29.** У выпадку вакансіі пасады Прэзыдэнта, немагчымасьці выкананьня ім сваіх абавязкаў на падставах, прадугледжаных Канстытуцыяй, яго паўнамоцтвы да прынясеньня Прысягі зноў абраным Прэзыдэнтам выконвае Старшыня Вярхоўнай рады. У гэтым выпадку паўнамоцтвы Старшыні Вярхоўнай рады пераходзяць да першага намесьніка Старшыні Вярхоўнай рады.

## Частка 4. ПАРЛЯМЭНТ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСІ — ВЯРХОЎНАЯ РАДА

**Артыкул 31.** Парлямэнт Рэспублікі Беларусі — Вярхоўная рада — зьяўляецца найвышэйшым прадстаўнічым, стала дзеючым і адзіным заканадаўчым органам дзяржаўнай улады Рэспублікі Беларусі.

**Артыкул 32.** Вярхоўная рада складаецца з 260 дэпутатаў, абраных грамадзянамі Рэспублікі Беларусі ў адпаведнасьці з законам на аснове ўсеагульнага, свабоднага, роўнага і прамога выбарчага права пры тайным галасаванні.
Выбары дэпутатаў Вярхоўнай рады праводзяцца ў адпаведнасьці з прынцыпамі прапарцыйна-мажарытарнага прадстаўніцтва: 130 дэпутатаў абіраюцца па аднамандатных выбарчых акругах (адна акруга — адзін дэпутат), 130 дэпутатаў абіраюцца па адзінай тэрытарыяльнай шматмандатнай выбарчай акрузе прапарцыйна ліку галасоў, пададзеных за рэспубліканскія сьпісы кандыдатаў у дэпутаты, вылучаных афіцыйна зарэгістраванымі Міністэрствам юстыцыі Рэспублікі Беларусі да прызначэньня выбараў палітычнымі партыямі альбо выбарчымі блёкамі (саюзамі) гэтых палітычных партый.

**Артыкул 33.** Дэпутатам Вярхоўнай рады можа быць абраны грамадзянін Рэспублікі Беларусь, які валодае выбарчым правам і дасягнуў 21 году.

**Артыкул 35.** Тэрмін паўнамоцтваў Вярхоўнай рады — чатыры гады.
Паўнамоцтвы Вярхоўнай рады могуць быць спыненыя датэрмінова пастановай Вярхоўнай рады, прынятай большасьцю ня менш як у дзьве траціны ад ліку абраных дэпутатаў Вярхоўнай рады.
Паўнамоцтвы Вярхоўнай рады могуць быць спыненыя датэрмінова па рашэньні Прэзыдэнта Рэспублікі Беларусі:
пры двухразовай адмове ў зацьвярджэньні кандыдатуры, прапанаванай Прэзыдэнтам на пасаду Прэм'ер-міністра, і пры незацьвярджэньні пасьля гэтага ў пасадзе Прэм'ер-міністра кандыдатуры, прапанаванай дэпутатамі Вярхоўнай рады;
пры выказваньні двухразовага вотуму недаверу Ўраду на працягу году.
Вярхоўная рада ня можа быць распушчаная ў час ваеннага і надзвычайнага становішча, уведзенага ў Рэспубліцы Беларусі; у апошнія шэсць месяцаў паўнамоцтваў Прэзыдэнта Рэспублікі Беларусі і ў час вырашэньня Вярхоўнай радай пытаньня аб датэрміновым вызваленьні, зьняцьці або

адхіленьні ад пасады Прэзыдэнта Рэспублікі Беларусі, а таксама калі пасьля датэрміновых выбараў Вярхоўнай рады не прайшло шэсьць месяцаў.

Чарговыя выбары Вярхоўнай рады прызначаюцца Прэзыдэнтам Рэспублікі Беларусі не раней чым за пяць месяцаў і не пазьней чым за чатыры месяцы да заканчэньня тэрміну паўнамоцтваў Вярхоўнай рады і праводзяцца не пазьней чым за месяц да заканчэньня тэрміну паўнамоцтваў Вярхоўнай рады.

Датэрміновыя выбары Вярхоўнай рады павінныя быць праведзеныя не пазьней чым на працягу трох месяцаў пасьля прыняцьця рашэньня аб датэрміновых выбарах.

**Артыкул 38.** Вярхоўная рада:
1) прымае і зьмяняе Канстытуцыю Рэспублікі Беларусі;
2) прымае законы, пастановы і кантралюе іх выкананьне;
3) дае тлумачэньне законаў Рэспублікі Беларусі;
4) прымае рашэньне аб правядзеньні рэспубліканскага рэфэрэндуму;
5) прызначае выбары Прэзыдэнта Рэспублікі Беларусі;
6) прызначае выбары прадстаўнічых органаў мясцовага самакіраваньня;
7) абірае судзьдзяў Канстытуцыйнага трыбуналу Рэспублікі Беларусь і прымае іх адстаўку;
8) абірае на пасаду і вызваляе ад пасады Ўпаўнаважанага па правах чалавека Рэспублікі Беларусі;
9) абірае на пасаду, вызваляе ад пасады Старшыню і членаў Кантрольнай палаты Рэспублікі Беларусі і прымае іх адстаўку;
10) абірае на пасаду, вызваляе ад пасады Старшыню і членаў Цэнтральнай выбарчай камісіі Рэспублікі Беларусі і прымае іх адстаўку;
11) па прадстаўленьні Прэзыдэнта Рэспублікі Беларусі абірае:
Прэм'ер-міністра Рэспублікі Беларусі;
Старшыню Канстытуцыйнага трыбуналу Рэспублікі Беларусі;
Генэральнага пракурора Рэспублікі Беларусі;
Старшыню Вярхоўнага суду Рэспублікі Беларусі;
Старшыню Вышэйшага гаспадарчага суду Рэспублікі Беларусі;
Старшыню Вышэйшага адміністратыўнага суду Рэспублікі Беларусі;
Старшыню Праўленьня Нацыянальнага банку Рэспублікі Беларусі;
12) па прапанове Прэм'ер-міністра зацьвярджае склад Ураду Рэспублікі Беларусі, выказвае вотум даверу Ўраду, прымае яго адстаўку;
13) па прапанове Генэральнага пракурора Рэспублікі Беларусі прызначае намесьнікаў Генэральнага пракурора і прымае іх адстаўку;
14) па прапанове органаў судовага самакіраваньня прызначае і вызваляе судзьдзяў Вярхоўнага суду, Вышэйшага гаспадарчага суду, Вышэйшага адміністратыўнага суду, а таксама прымае іх адстаўку;
15) на прапанову Старшыні Праўленьня Нацыянальнага банку Рэспублікі Беларусі зацьвярджае членаў Праўлення Нацыянальнага банка і прымае іх адстаўку;
16) у трохдзённы тэрмін з моманту ўнясеньня разглядае ўказы Прэзыдэнта Рэспублікі Беларусі аб увядзеньні ў краіне ваеннага або надзвычайнага становішча, поўнай або частковай мабілізацыі ваеннаабавязаных;
17) вызначае парадак вырашэньня пытаньняў адміністратыўна-тэрытарыяльнага ўпарадкаваньня дзяржавы;
18) вызначае асноўныя кірункі ўнутранай і замежнай палітыкі Рэспублікі Беларусі;
19) зацьвярджае рэспубліканскі бюджэт і справаздачу аб яго выкананьні, нарматывы адлічэньняў ад рэспубліканскіх падаткаў і збораў у мясцовыя бюджэты;
20) вызначае рэспубліканскія падаткі і зборы, ажыцьцяўляе кантроль над грашовай эмісіяй;
21) ратыфікуе і дэнансуе міжнародныя дамовы Рэспублікі Беларусі;
22) на прапанову Прэзыдэнта Рэспублікі Беларусі зацьвярджае ваенную дактрыну, абвяшчае вайну і заключае мір;
23) засноўвае дзяржаўныя ўзнагароды, клясныя чыны і званьні Рэспублікі Беларусі;
24) прымае адстаўку Прэзыдэнта Рэспублікі Беларусі;
25) датэрмінова вызваляе Прэзыдэнта Рэспублікі Беларусі ад пасады пры ўстойлівай няздольнасьці па стану здароўя выконваць абавязкі;
26) вылучае па прапанове ня менш як адной траціны ад ліку абраных дэпутатаў Вярхоўнай рады прапанову аб зняцьці Прэзыдэнта Рэспублікі Беларусі з пасады ў выпадку парушэньня ім Канстытуцыі Рэспублікі Беларусі.
Рашэньне аб зняцьці Прэзыдэнта з пасады прымаецца большасьцю ня менш як у дзьве траціны галасоў ад ліку абраных дэпутатаў Вярхоўнай рады на падставе заключэньня Канстытуцыйнага трыбуналу, які пацьвярджае факт парушэньня Прэзыдэнтам Канстытуцыі;
27) выносіць на прапанову ня менш як адной траціны ад ліку абраных дэпутатаў Вярхоўнай рады абвінавачаньне супраць Прэзыдэнта Рэспублікі Беларусі ў зьдзяйсьненьні дзяржаўнай здрады або іншага цяжкага злачынства.
Прызначае для расьследаваньня спэцыяльнага пракурора і на падставе яго заключэньня ня менш як дзьвюма трацінамі галасоў ад ліку абраных дэпутатаў Вярхоўнай рады прымае рашэньне аб адхіленьні Прэзыдэнта Рэспублікі Беларусі ад пасады;
28) прымае на прапанову Ўраду на падставе рашэньня Канстытуцыйнага трыбуналу пастановы аб роспуску прадстаўнічых органаў мясцовага самакіраваньня ў выпадку грубага або неаднаразовага парушэньня імі Канстытуцыі або законаў і прызначае новыя выбары;
29) устанаўлівае дзяржаўныя сьвяты і сьвяточныя дні;
30) прымае рашэньне аб амністыі;
31) адмяняе рашэньні Старшыні Вярхоўнай рады ў выпадках, калі яны супярэчаць законам і пастановам Вярхоўнай рады;
32) зацьвярджае Рэглямэнт дзейнасьці Вярхоўнай рады, вырашае іншыя пытаньні, аднесеныя Канстытуцыяй і законамі Рэспублікі Беларусі да кампэтэнцыі Вярхоўнай рады.

**Артыкул 39.** Прынятыя законы ў двухтыднёвы тэрмін са дня прыняцьця накіроўваюцца на подпіс Прэзыдэнту Рэспублікі Беларусі.
Прэзыдэнт у двухтыднёвы тэрмін падпісвае закон або вяртае яго ў Вярхоўную раду непадпісаным са сваімі заўвагамі і прапановамі.
Калі закон на працягу двух тыдняў не вяртаецца Прэзыдэнтам у Вярхоўную раду, ён лічыцца падпісаным.
Калі Вярхоўная рада на працягу месяцу з дня вяртаньня непадпісанага закону Прэзыдэнтам Рэспублікі Беларусі прагаласуе за яго прыняцьце большасьцю галасоў ад ліку абраных дэпутатаў Вярхоўнай рады, закон лічыцца прынятым, і Прэзыдэнт абавязаны яго падпісаць у пяцідзённы тэрмін.

Частка 5. УРАД — САВЕТ МІНІСТРАЎ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСІ

**Артыкул 49.** Урад — Савет Міністраў Рэспублікі Беларусі — найвышэйшы орган выканаўчай улады.
Урад праводзіць унутраную і замежную палітыку ў адпаведнасьці з Канстытуцыяй і законамі Рэспублікі Беларусі.
Урад у сваёй дзейнасьці падсправаздачны Вярхоўнай радзе.
Урад складае свае паўнамоцтвы перад ізноў выбранай Вярхоўнай радай.

**Артыкул 51.** Урад альбо любы член Ураду маюць права заявіць аб сваёй адстаўцы, калі лічаць немагчымым выкананьне ўскладзеных на іх абавязкаў.
Прэм'ер-міністар можа паставіць перад Вярхоўнай радай пытаньне аб даверы Ўраду па прадстаўленай Праграме або з пэўнай нагоды. Калі Вярхоўная рада ў даверы адмаўляе, Урад складае свае паўнамоцтвы.
Дэпутаты Вярхоўнай рады ў колькасьці ня менш за 60 чалавек таксама маюць права паставіць перад Вярхоўнай радай пытаньне аб даверы Ўраду або члену Ўраду. Вынясеньне вотуму недаверу Прэм'ер-міністру, у тым ліку і ў выпадку выкананьня ім абавязкаў міністра, азначае вынясеньне вотуму недаверу Ўраду.
Пры выказваньні двухразовага вотуму недаверу Ўраду на працягу году Прэзыдэнт можа распусціць Вярхоўную раду і прызначыць новыя выбары.
У выпадку адстаўкі альбо складаньня паўнамоцтваў Урад на даручэньне Прэзыдэнта працягвае ажыццяўляць свае паўнамоцтвы да фарміравання новага складу Ўраду.

**Артыкул 52.** Прэм'ер-міністар:
1) прадстаўляе Ўрад;
2) ажыцьцяўляе непасрэднае кіраўніцтва дзейнасьцю Ўраду і нясе персанальную адказнасьць за яго працу;
3) падпісвае пастановы Ўраду;
4) інфармуе Парлямэнт аб асноўных кірунках дзейнасьці Ўраду і аб усіх яго найважнейшых рашэньнях;
5) выконвае іншыя функцыі, зьвязаныя з арганізацыяй і дзейнасьцю Ўраду.
Прэм'ер-міністар выдае ў межах сваёй кампэтэнцыі распараджэньні.

**Артыкул 54.** Урад у мэтах забесьпячэньня аднолькавага выкананьня Канстытуцыі і іншых актаў заканадаўства, а таксама каардынацыі дзейнасьці Ўраду і органаў мясцовага самакіраваньня можа мець сваіх упаўнаважаных прадстаўнікоў у адпаведных адміністратыўна-тэрытарыяльных адзінках.
Упаўнаважаныя прадстаўнікі Ўраду ня маюць права ўмешвацца ў кампэтэнцыю органаў мясцовага самакіраваньня і ажыцьцяўляюць свае паўнамоцтвы ў адпаведнасьці з палажэньнем аб іх, якое зацьвярджаецца Ўрадам узгоднена з органамі мясцовага самакіраваньня.
Упаўнаважаныя прадстаўнікі Ўраду маюць права ставіць ва ўстаноўленым парадку пытаньні аб адмене рашэньняў органаў мясцовага самакіраваньня, якія супярэчаць заканадаўству Рэспублікі Беларусі.

Частка 6. СУД

**Артыкул 55.** Судовая ўлада ў Рэспубліцы Беларусь зьяўляецца самастойнай і незалежнай.
Функцыяй судовай улады зьяўляецца публічны разгляд прававых спрэчак і канфліктаў, а таксама абарона правоў і свабод грамадзянаў, законных інтарэсаў юрыдычных асоб ад неправамерных дзеяньняў і рашэньняў.
Уладкаваньне судоў, іх паўнамоцтвы і парадак разгляду справаў у судах вызначаюцца законам.

**Артыкул 61.** Пры ажыцьцяўленьні правасудзьдзя судзьдзі незалежныя і падпарадкоўваюцца толькі Канстытуцыі і законам.
Непасрэдны або ўскосны ўплыў на судзьдзяў з боку якіх-небудзь службовых асоб або грамадзян у сувязі з судаводзтвам па пэўных справах прызнаецца злачынствам і цягне за сабой устаноўленую законам адказнасьць.
Судзьдзі ня могуць быць членамі палітычных партый і іншых арганізацый, якія маюць палітычныя мэты, ня могуць займаць іншыя пасады, атрымліваць акрамя заработнай платы грашовыя ўзнагароды, за выключэньнем выкладчыцкай дзейнасьці, ганарараў за творы навукі, літаратуры і мастацтва.

**Артыкул 62.** Судзьдзі Вярхоўнага суду, Вышэйшага гаспадарчага суду, Вышэйшага адміністратыўнага суду абіраюцца Вярхоўнай радай на прапанову органаў судзейскага самакіраваньня.
Судзьдзі ніжэйшых судоў прызначаюцца на пасаду Прэзыдэнтам Рэспублікі Беларусь па прадстаўленьні органаў судзейскага самакіраваньня, за выключэньнем міравых судзьдзяў. Парадак абраньня міравых судзьдзяў і зьняцьця іх з пасады вызначаецца законам.

**Артыкул 65.** Судовы разгляд ва ўсіх судах адкрыты для публікі. Слуханьне справаў у закрытым паседжаньні дапускаецца толькі ў выпадках, прадугледжаных законам.
Завочны разгляд справаў у судах першай і апэляцыйнай інстанцый не дапускаецца.

РАЗЬДЗЕЛ 3. КАНТРОЛЬНЫЯ І НАГЛЯДНЫЯ ОРГАНЫ

Частка 7. КАНСТЫТУЦЫЙНЫ ТРЫБУНАЛ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСІ

**Артыкул 70.** Канстытуцыйны трыбунал ажыцьцяўляе кантроль за канстытуцыйнасьцю нарматыўных прававых актаў, якія выдаюцца органамі дзяржаўнай улады і мясцовага самакіраваньня, а таксама вырашае іншыя пытаньні, аднесеныя законам да яго кампэтэнцыі.
Канстытуцыйны Трыбунал разглядае справы:
1) аб адпаведнасьці законаў, міжнародных дагаворных і іншых абавязальніцтваў Рэспублікі Беларусь Канстытуцыі, міжнародна-прававым актам, ратыфікаваным Рэспублікай Беларусь;
2) аб адпаведнасьці нарматыўных прававых актаў Прэзыдэнта, Рады міністраў, Вярхоўнага суду, Вышэйшага гаспадарчага суду, Вышэйшага адміністратыўнага суду, Генэральнага пракурора Канстытуцыі, законам і міжнародна-прававым актам, ратыфікаваным Рэспублікай Беларусь;
3) аб канстытуцыйнасьці фармулёвак пытаньняў, якія выносяцца на рэспубліканскі рэфэрэндум;
4) аб канстытуцыйнасьці рашэньня Вярхоўнай рады аб прызначэньні або аб адмове ў прызначэньні рэспубліканскага рэфэрэндуму;
5) аб размежаваньні кампэтэнцыі паміж вышэйшымі органамі дзяржаўнай улады, а таксама паміж органамі дзяржаўнай улады і органамі мясцовага самакіраваньня;
6) аб парушэньні Прэзыдэнтам Канстытуцыі Рэспублікі Беларусі;
Па запытах упаўнаважаных суб'ектаў Канстытуцыйны трыбунал дае афіцыйнае тлумачэньне Канстытуцыі Рэспублікі Беларусь.
Канстытуцыйны трыбунал у адпаведнасьці з законам прымае да разгляду скаргі кожнага ў выпадку ўціску яго канстытуцыйных праў і свабод у нарматыўных прававых актах, выдадзеных органамі дзяржаўнай улады.
Да кампэтэнцыі Канстытуцыйнага трыбуналу могуць быць аднесеныя і іншыя пытаньні ў выпадках, прадугледжаных Канстытуцыяй і законамі.

**Артыкул 71.** Канстытуцыйны трыбунал складаецца з 12 судзьдзяў, якія абіраюцца на пасаду Вярхоўнай радай на альтэрнатыўнай аснове.
Судзьдзём Канстытуцыйнага трыбуналу можа быць абраны грамадзянін Рэспублікі Беларусі, які мае вышэйшую юрыдычную адукацыю, агульнапрызнаныя дасягненьні ў сфэры права і які адпрацаваў па юрыдычнай спэцыяльнасьці ня менш за 15 гадоў.
Старшыня Канстытуцыйнага трыбуналу зацьвярджаецца ў пасадзе Вярхоўнай радай тэрмінам на пяць гадоў на прапанову Прэзыдэнта Рэспублікі Беларусі. Кандыдатура Старшыні Канстытуцыйнага трыбуналу ўносіцца на падставе рэкамэндацыі судзьдзяў Канстытуцыйнага трыбуналу.
Намесьнік Старшыні Канстытуцыйнага трыбуналу абіраецца судзьдзямі Канстытуцыйнага трыбуналу шляхам тайнага галасаваньня на 5 гадоў.
Тэрмін паўнамоцтваў судзьдзяў Канстытуцыйнага трыбуналу — 10 гадоў.
Паўторнае абраньне на пасаду судзьдзі Канстытуцыйнага трыбуналу не дапускаецца.

**Артыкул 73.** Нарматыўныя прававыя акты органаў дзяржаўнай улады, прызнаныя Канстытуцыйным трыбуналам не адпаведнымі Канстытуцыі, страчваюць юрыдычную сілу з дня, вызначанага ў рашэньні Канстытуцыйнага трыбуналу.
Невыкананьне рашэньняў Канстытуцыйнага трыбуналу цягне за сабой адказнасьць па законе.

**Артыкул 74.** Пытаньні, аднесеныя да кампэтэнцыі Канстытуцыйнага трыбуналу, разглядаюцца на адкрытых паседжаньнях.
Рашэньні Канстытуцыйнага трыбуналу абвяшчаюцца публічна, зьяўляюцца канчатковымі і абскарджаньню не падлягаюць.

Частка 8. УПАЎНАВАЖАНЫ ПА ПРАВАХ ЧАЛАВЕКА

**Артыкул 75.** Упаўнаважаны па правах чалавека дзейнічае ў мэтах абароны праў і свабод асобы, прадугледжаных Канстытуцыяй і заканадаўствам Рэспублікі Беларусь.

**Артыкул 76.** Упаўнаважаным па правах чалавека можа быць абраны грамадзянін Рэспублікі Беларусь, не маладзейшы за 40 гадоў, які мае веды ў галіне правоў чалавека, досьвед праваабарончай дзейнасьці і які валодае высокімі маральнымі якасьцямі.
Упаўнаважаны па правах чалавека абіраецца Вярхоўнай радай на альтэрнатыўнай аснове тэрмінам на пяць гадоў. Адна і тая ж асоба ня можа быць абраная на пасаду Ўпаўнаважанага па правах чалавека больш чым на два тэрміны.
Кандыдатуру на пасаду Ўпаўнаважанага па правах чалавека могуць прапаноўваць дэпутаты Вярхоўнай рады ў колькасьці ня меней за 40 чалавек.
На час сваіх паўнамоцтваў Упаўнаважаны па правах чалавека прыпыняе сваё членства ў палітычных партыях і іншых грамадзкіх аб'яднаньнях, якія маюць палітычныя мэты.
Упаўнаважаны па правах чалавека ня можа: зьяўляцца дэпутатам Вярхоўнай рады; членам палітычных партый і іншых арганізацый, якія маюць палітычныя мэты; займаць іншыя пасады; атрымліваць акрамя заработнай платы грашовыя ўзнагароды, за выключэньнем выкладчыцкай дзейнасьці, ганарараў за творы навукі, літаратуры і мастацтва.

**Артыкул 77.** Упаўнаважаны па правах чалавека мае права:
1) запытваць і атрымліваць ад дзяржаўных органаў, органаў мясцовага самакіраваньня, службовых асоб зьвесткі, дакумэнты і матэрыялы, неабходныя для разгляду скаргі, якая паступіла да яго;
2) атрымліваць тлумачэньні ад службовых асоб у час разглядаў скарг;
3) наведваць самастойна або сумесна з прадстаўнікамі кампэтэнтных дзяржаўных органаў дзяржаўныя органы, вайсковыя часткі, месцы папярэдняга зьняволеньня і адбываньня крымінальных пакараньняў і іншыя арганізацыі;
4) выносіць заключэньні па сутнасьці скаргі і прапаноўваць дзяржаўным органам, органам мясцовага самакіраваньня, службовым асобам аднавіць парушаныя правы;
5) зьвяртацца ў суд і іншыя дзяржаўныя органы з заявай у абарону правоў і свабод, парушаных рашэньнем або дзеяньнем (бязьдзейнасьцю) дзяржаўнага органа, органа мясцовага самакіраваньня, службовай асобы, а таксама асабіста або праз свайго прадстаўніка ўдзельнічаць у судовым працэсе;
6) зьвяртацца ў Канстытуцыйны трыбунал з прапановай аб праверцы канстытуцыйнасьці нарматыўных прававых актаў;
7) у выпадку масавых або грубых парушэньняў правоў чалавека зьвяртацца ў Вярхоўную раду з прапановай аб правядзеньні парлямэнцкіх слуханьняў або аб стварэньні парлямэнцкай камісіі па расьсьледаваньні фактаў парушэньня правоў і свабод грамадзян.
Па заканчэньні каляндарнага году Ўпаўнаважаны па правах чалавека на падставе разгледжаных матэрыялаў рыхтуе даклад аб сытуацыі з правамі чалавека ў Рэспубліцы Беларусь, які заслухоўваецца на чарговай сэсіі Вярхоўнай рады. Па выніках абмеркаваньня дакладу Вярхоўная рада прымае пастанову.
Упаўнаважаны па правах чалавека можа мець іншыя паўнамоцтвы, прадстаўленыя яму законам.

**Артыкул 79.** Упаўнаважаны па правах чалавека валодае недатыкальнасьцю на працягу ўсяго тэрміну яго паўнамоцтваў. Ён ня можа быць бяз згоды Вярхоўнай рады прыцягнуты да крымінальнай адказнасьці, затры-

маны або арыштаваны па падазрэньні ў зьдзяйсьненьні злачынства, за выключэньнем выпадкаў затрыманьня на месцы зьдзяйсьненьня цяжкага або асабліва цяжкага злачынства.
Умяшальніцтва ў дзейнасьць Упаўнаважанага па правах чалавека з мэтай паўплываць на яго рашэньне, а таксама перашкоджваньне дзейнасьці Ўпаўнаважанага па правах чалавека ў іншай форме цягнуць за сабой адказнасьць па закону.
Гарантыі незалежнасьці Ўпаўнаважанага па правах чалавека і забеспячэньня яго дзейнасьці ўстанаўліваюцца на ўзроўні, прадугледжаным для дэпутатаў Вярхоўнай рады.

Частка 9. КАНТРОЛЬНАЯ ПАЛАТА РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСІ

**Артыкул 80.** Кантрольная палата Рэспублікі Беларусь ажыцьцяўляе кантроль за выкананьнем рэспубліканскага бюджэту, выкарыстаньнем дзяржаўнай уласнасьці.
Кантрольная палата ствараецца на першай сэсіі зноў абранай Вярхоўнай рады ў складзе Старшыні і васьмі ўдзельнікаў на тэрмін паўнамоцтваў Вярхоўнай рады.
Члены Кантрольнай палаты працуюць на прафэсійнай аснове і па сваім службовым статусе прыраўноўваюцца да дэпутатаў Вярхоўнай рады.

**Артыкул 81.** У межах сваіх паўнамоцтваў Кантрольная палата ажыцьцяўляе кантроль за дзейнасьцю Ўраду і іншых органаў дзяржаўнага кіраваньня, Нацыянальнага банку, іншых дзяржаўных арганізацый.
На даручэньне Вярхоўнай рады Кантрольная палата прадстаўляе аналіз выкананьня рэспубліканскага бюджэту, дае заключэньне аб праекце рэспубліканскага бюджэту на наступны фінансавы год, прадстаўляе інфармацыю аб выніках кантролю дзейнасьці Ўраду, іншых органаў дзяржаўнага кіраваньня, Нацыянальнага банку, іншых дзяржаўных арганізацый.
Паўнамоцтвы, структура, парадак арганізацыі і дзейнасьці Кантрольнай палаты вызначаюцца законам.

Частка 10. ПРАКУРАТУРА РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСІ

**Артыкул 83.** Генэральны пракурор і ніжэйшыя пракуроры незалежныя ў ажыцьцяўленьні сваіх паўнамоцтваў і кіруюцца толькі законам. У сваёй дзейнасьці Генэральны пракурор падсправаздачны Вярхоўнай радзе.
Паўнамоцтвы, арганізацыя і парадак дзейнасьці Пракуратуры вызначаюцца законам.

РАЗЬДЗЕЛ IV. МЯСЦОВАЕ САМАКІРАВАНЬНЕ

**Артыкул 90.** Выбары прадстаўнічых органаў мясцовага самакіраваньня праводзяцца ў парадку, вызначаным законам, у адпаведнасьці з прынцыпамі прапарцыйна-мажарытарнага або мажарытарнага прадстаўніцтва ў залежнасьці ад колькасьці грамадзян, якія пражываюць на тэрыторыі мясцовага самакіраваньня.
У прадстаўнічы орган мясцовага самакіраваньня можа быць абраны грамадзянін Рэспублікі Беларусь, які валодае выбарчым правам і дасягнуў 18 гадоў.
Прадстаўнічыя органы мясцовага самакіраваньня абіраюцца грамадзянамі, якія пражываюць на тэрыторыі дзейнасьці мясцовага самакіраваньня, тэрмінам на чатыры гады.

**Артыкул 92.** Прадстаўнічы орган мясцовага самакіраваньня:
кіруе справамі мясцовага самакіраваньня;
ажыцьцяўляе правы ўласьніка ў дачыненьні камунальнай уласнасьці, распараджаецца даходамі мясцовага самакіраваньня;
усталёўвае мясцовыя падаткі і зборы ў адпаведнасьці з законам;
засноўвае сымбалі мясцовага самакіраваньня;
зьвяртаецца ў кампэтэнтныя органы па пытаньнях, якія закранаюць інтарэсы мясцовага насельніцтва;
супрацоўнічае зь іншымі органамі мясцовага самакіраваньня, ставарае зь імі сумесныя арганізацыі, а таксама саюзы (асацыяцыі) органаў мясцовага самакіраваньня, якія прадстаўляюць іх інтарэсы;
узаемадзейнічае ў межах сваёй кампэтэнцыі з органамі мясцовага самакіраваньня іншых краін і можа зьяўляцца членам міжнародных арганізацый самакіраваньня.
Рашэньне прадстаўнічага органа мясцовага самакіраваньня можа быць адмененым або зьмененым толькі рашэньнем суда ў выпадку яго супярэчнасьці закону.
Дэпутаты рады не нясуць адказнасьці за выяўленыя меркаваньні і галасаваньне пры ажыцьцяўленьні сваіх паўнамоцтваў.

**Артыкул 93.** Мясцовае самакіраваньне мае права на ўласныя прыбыткі, неабходныя для выкананьня задач, вызначаных законам, а таксама на атрыманьне дзяржаўных датацый і субсыдый, адпаведных гэтым задачам.
Органы мясцовага самакіраваньня могуць надзяляцца законам асобнымі дзяржаўнымі паўнамоцтвамі зь перадачай неабходных для іх ажыцьцяўленьня матэрыяльных і фінансавых сродкаў.
Мясцоваму самакіраваньню кампэнсуюцца дадатковыя выдаткі, узьніклыя ў выніку рашэньняў, прынятых органамі дзяржаўнай улады.

**Артыкул 94.** Матэрыяльна-фінансавую базу мясцовага самакіраваньня складаюць камунальная ўласнасьць, мясцовы бюджэт, а таксама агульныя субсыдыі і датацыі зь дзяржаўнага бюджэту.
Канфіскацыя сродкаў мясцовага бюджэту для дзяржаўных патрэб не дапускаецца.

**Артыкул 97.** Вярхоўная рада на прапанову Ўраду можа распусьціць прадстаўнічы орган мясцовага самакіраваньня, калі ён, паводле рашэньня Канстытуцыйнага трыбуналу, груба або неаднаразова парушаў Канстытуцыю або законы.

РАЗЬДЗЕЛ V. ЗАКЛЮЧНЫЯ І ПЕРАХОДНЫЯ ПАЛАЖЭНЬНІ

**Артыкул 99.** Малая Канстытуцыя Рэспублікі Беларусь зьяўляецца законам простага дзеяньня і валодае найвышэйшай юрыдычнай сілай на тэрмін да прыняцьця новай Канстытуцыі Рэспублікі Беларусь.
Палажэньні дзеючай Канстытуцыі Рэспублікі Беларусь застаюцца ў сіле ў частках, якія не супярэчаць Малой Канстытуцыі.
З моманту ўваходжаньня Малой Канстытуцыі ў сілу сьмяротнае пакараньне не ўжываецца.
Іншыя нарматыўныя прававыя акты Рэспублікі Беларусь дзейнічаюць у частках, якія не супярэчаць Малой Канстытуцыі.
Пытаньні аб канстытуцыйнасьці нарматыўных прававых актаў вырашаюцца Канстытуцыйным трыбуналам ва ўстаноўленым парадку.

**Артыкул 100.** Органы дзяржаўнай улады і кіраваньня да іх фарміраваньня ў адпаведнасьці з Малой Канстытуцыяй дзейнічаюць на падставе заканадаўства Рэспублікі Беларусь, якое не супярэчыць Малой Канстытуцыі.

# ...Канстытуцыя

**Працяг са старонкі 3.**

тойнай. Прэзыдэнт зможа толькі зацьвярджаць абласных і раённых судзьдзяў, але не прызначаць. Прапаноўваць судзьдзяў на гэтыя пасады будуць мясцовыя органы судовага самакіраваньня. У Вярхоўны суд, Вышэйшы гаспадарчы суд і Вышэйшы адміністрацыйны суд судзьдзяў будзе зацьвярджаць парлямэнт.

Канстытуцыйны суд мусіць замяніць Канстытуцыйны трыбунал, так гэты орган называецца і ў Польшчы. Паўнамоцтвы і кампэтэнцыі Канстытуцыйнага трыбуналу будуць істотна пашыраныя. Ён будзе тлумачыць канстытуцыйныя нормы, разглядаць пытаньне адносна канстытуцыйнасьці правядзеньня таго ці іншага рэфэрэндуму, вырашаць спрэчкі між органамі ўлады. У Канстытуцыйны трыбунал змогуць зьвяртацца і простыя грамадзяне, і прадстаўнікі органаў мясцовага самакіраваньня. Уводзяцца ў практыку міравыя суды — найніжэйшае зьвяно ў судовай сыстэме, іх сфэрай стануць ня самыя значныя адміністрацыйныя, грамадзянскія справы. Там змогуць працаваць судзьдзі пасьля адстаўкі.

Галоўным кантралюючым органам будзе Канстытуцыйны трыбунал. Таксама Вярхоўная рада тэрмінам на пяць гадоў мае абіраць упаўнаважанага па правах чалавека. Ён будзе дзейнічаць у мэтах абароны правоў і свабодаў асобы, гарантаваных Канстытуцыяй.

Кантрольная палата будзе сачыць за выкананьнем дзяржбюджэту. Яна будзе фармавацца на першай сэсіі Вярхоўнай рады. У Кантрольную палату ўвойдуць восем чалавек, па сваім статусе прыроўненыя да дэпутатаў Рады. Яшчэ будзе ўведзеная назіральная рада па тэле- і радыёвяшчаньню — для кантролю за законнасьцю выдачы ліцэнзій вяшчальным арганізацыям».

**Зьміцер Панкавец**

# Дэмарш Мандэльсона

21 чэрвеня Эўрапэйскі Зьвяз пазбавіў Беларусь гандлёвых прэфэрэнцый за парушэньне правоў працоўных. Гэтая санкцыя закране 10% беларускага экспарту ў Эўропу.

Беларусь губляе права на гандлёвыя льготы пры экспарце тавараў у краіны ЭЗ. Камісар ЭЗ па справах гандлю Пэтэр Мандэльсан патлумачыў, што рашэньне зьвязана з парушэньнем правоў прафсаюзаў у краіне.

Пасьля выключэньня Беларусі з Абагуленай сыстэмы прэфэрэнцый на нашу краіну будуць распаўсюджвацца стандартныя імпартныя пошліны, на 3% вышэйшыя за льготныя. Выключэньне Беларусі з АСП закране прыкладна 10 % беларускага экспарту ў ЭЗ.

**СМ**



**Пэтар Мандэльсан: У Беларусі абсалютна не выконваюцца нормы працоўнага заканадаўства Міжнароднай арганізацыі працы, згодна зь якімі ўсе працоўныя маюць права аб’ядноўвацца ў прафсаюзы і заключаць калектыўныя пагадненьні аб заробку з наймальнікамі.**

### КАМЭНТАР

## Працьвеaccording

Пра страту прэфэрэнцыяў дзяржаўныя мэдыі маўчаць. Хоць ня кожны дзень дзяржаву караюць на 400 мільёнаў эўра! Што да пазбаўленьня прэфэрэнцыяў у гандлі з ЭЗ, дык гэта ўвогуле другі выпадак у гісторыі. Да Беларусі так уганаравалі толькі М’янму-Бірму зь яе фактычна прыгонным ладам.

Эканамісты ўвесь час цьвердзілі, што ў нас малая адкрытая эканоміка, але гэта неяк у адно вуха ўлятала, праз іншае вылятала. Нафтавы афшор стварыў ілюзію вечнага раю. Цяпер надыходзіць працьверазеньне. 400 мільёнаў эўра — сума не сьмяротная. Але амаль столькі ж мы ўжо завінаваціліся за газ Расеі. Неспрыяльныя чыньнікі нарастаюць сьнежным камяком. І ці не справакуе адзін зь іх лявіну? Нездарма рэфрэнам гучыць цяпер у вуснах афіцыйнага кіраўніка: страшная не апазыцыя, страшны фінансавы, эканамічны абвал.

**Аляксандар Класкоўскі**

# Мілінкевіч дае шанец



АНДРЭЙ ЛЯНКЕВІЧ

**Мілінкевіч з паплечнікамі ў калідорах Мінюсту.**

Рэгістрацыя «Руху «За Свабоду» як індыкатар дэмакратызацыі.

Аляксандар Мілінкевіч наведаў Міністэрства юстыцыі і падаў заяўку на рэгістрацыю Рэспубліканскага праваабарончага грамадзкага аб’яднаньня «Рух «За Свабоду».

«Рэгістрацыя Руху зьяўляецца адным з індыкатараў дэмакратызацыі аўтарытарнага рэжыму. Пяць галоўных кірункаў нашай дзейнасьці — гэта абарона правоў чалавека, пабудова грамадзянскай супольнасьці, захаваньне незалежнасьці і сувэрэнітэту, правядзеньне свабодных і дэмакратычных выбараў, а таксама эўрапейскі вэктар разьвіцьця нашага грамадзтва», — заявіў палітык.

20 траўня ў Горадні прайшоў установчы сход «Руху «За свабоду». Старшынём аб’яднаньня быў абраны А.Мілінкевіч. Яго намесьнікамі — Юрась Губарэвіч і Віктар Карняенка. У сходзе ўзялі ўдзел каля ста актывістаў з усёй Беларусі.

**МБ**

## Прэмія Ластоўскага матэматыку, мэдыку і кліматолягу

16 чэрвеня ва ўправе БНФ ганаравалі прэміяй імя Вацлава Ластоўскага. Яе заснавалі Таварыства беларускай школы, Асацыяцыя беларусістаў, Згуртаваньне беларусаў сьвету.

Прэмію атрымліваюць беларускамоўныя выкладчыкі тых дысцыплінаў, якія рэдка у ВНУ чытаюцца па-беларуску.

Сёлета ляўрэатамі сталі матэматык Тамара Сухая, мэдык Аляксандар Арцішэўскі і кліматоляг Павал Каўрыга. Іх абралі сярод 14 фіналістаў конкурсу.

Тамара Сухая выкладае вышэйшую матэматыку ў БНТУ, яна аўтар пяці дапаможнікаў. Доктар мэдыцынскіх навук Аляксандар Арцішэўскі выкладае на катэдры марфалёгіі чалавека Мэдуніверсытэту. Галоўны кліматоляг краіны Павал Каўрыга — аўтар «Расейска-беларускага слоўніка па мэтэаралёгіі і кліматалёгіі».

**Зьміцер Панкавец**

# Бывай, Сэвэрын

Рада ААН у правах чалавека выключыла Беларусь ды Кубу з «чорнага сьпісу краін», якія патрабуюць сталага назіраньня.

Сваё рашэньне Рада аргумэнтавала тым, што ў гэтых краінах спэцдакладчыкі працавалі больш за шэсьць гадоў.

Сталае назіраньне застанецца ў дзевяці праблемных краінах, уключна з Паўночнай Карэяй, Камбоджай, Суданам, Самалі. У дачыненьні да іншых краін-сябраў ААН будзе ўжывацца практыка пэрыядычнага назіраньня за станам правоў чалавека.

**Паводле радыё «Свабода»**

КАМЭНТАР

## Скасавалі мёртваму прыпаркі

Піша Аляксандар Класкоўскі.

Афіцыйны Менск сьвяткуе такую рэдкую апошнім часам удачу на дыпляматычным фронце. Рада ААН у правах чалавека скасавала мандат адмысловага дакладчыка па Беларусі.

На гэтую вестку адразу ж адгукнуліся медныя трубы айчыннай прапаганды (пры тым што выключэньне краіны з Абагуленай сыстэмы прэфэрэнцый Эўразьвязу — рашэньне куды болей важкае — дзяржаўныя мэдыі сустрэлі магільным маўчаньнем).

Выйгрыш піяраўскі. Бо ААН не перастае сачыць за станам правоў чалавека ў Беларусі, як пасьпяшаліся зазначыць некаторыя агенцыі. Проста мяняецца мэханізм. Зь іншага боку, кладучы руку на сэрца, і ранейшыя рэзалюцыі ААНаўскай інстытуцыі былі як мёртваму прыпаркі. Сьмех сказаць: спэцдакладчыка Адрыяна Сэвэрына не пускалі ў краіну (а паказаўшы дулю праз браму, яшчэ і папракалі потым за неаб’ектыўнасьць!)

Разумны спажывец айчыннага афіцыёзу раскумекае, што да чаго, ужо з тае акалічнасьці, што Беларусь вывелі за дужкі разам з Кубай — «выспай Свабоды» ў дзьвюхкосьсі. Экспэрты наўпрост зьвязваюць рашэньне зь ціскам «усходняй бальшыні» Рады ААН у правах чалавека. Маўляў, Беларусь мусілі скарыстаць як разьменную карту, каб не спаралізаваць працу гэтай інстытуцыі.

Яна паўстала летась замест адпаведнага камітэту Аб’яднаных Нацый. Але выглядае на тое, што памянялі быка на індыка. Сярод чальцоў новай Рады, якая фармуецца паводле рэгіянальнага прынцыпу, — у прыватнасьці, такія праблемныя з гледзішча праваабарончага руху дзяржавы, як Расея, Кітай і тая самая Куба. Дый Беларусь некалькі тыдняў таму была ўжо адной нагой там.

Усе гэтыя манэўры сьведчаць, найперш, пра глыбокую крызу самой ААН. Пад дахам не адэкватнай выклікам часу глябальнае структуры мусяць неяк ужывацца дзьве сотні жахліва розных краінаў — багатыя і жабрацкія, дэмакратычныя і дыктатарскія… На жаль, болей менавіта праблемных. Што і стварае адпаведную аўру, у тым ліку і ў пытаньні правоў чалавека. Няўжо ж Гавана будзе кідаць камень у афіцыйны Менск?

Захад жа апошнім часам аддае перавагу не анэмічным рэзалюцыям ад імя разнашэрсных структураў, а санкцыям, што ўводзяцца цэнтрамі прыманьня рашэньняў — Вашынгтонам ды Брусэлем. «Думаю, калі б Менску далі магчымасьць выбіраць, ці захаваць прэфэрэнцыі ў гандлі, ці скасаваць мандат спэцдакладчыка, тут без ваганьняў выбралі б першае», — мяркуе палітоляг Андрэй Фёдараў.

На ягоную думку, скасаваньне мандату Сэвэрына — для беларускіх праваабаронцаў момант хоць і непрыемны, але не трагічны. Дэмакратычны дрэйф краіны будзе вызначацца іншымі чыньнікамі.

СЬЦІСЛА

### Мінадукацыі хоча вярнуць мову ў ВНУ

У Міністэрстве адукацыі не выключаюць увядзеньня зь верасьня ў ВНУ абавязковага курсу прафэсійнай лексыкі беларускай мовы. У 2006—2007 г. курс быў факультатыўным. Старшыня «Таварыства беларускай мовы» Алег Трусаў задаволены станоўчай рэакцыяй Адміністрацыі прэзыдэнта на тысячы лістоў грамадзян, якія прапанавалі пакінуць у ВНУ абавязковае вывучэньне курсу прафэсійнай лексыкі беларускай мовы.

### «Рэспубліка» прабачылася перад каталікамі

Урадавая газэта «Рэспубліка» прынесла прабачэньні за «некарэктныя выказваньні» на адрас Касьцёлу і Папы Яна Паўла II ў артыкуле «Новыя крыжаносцы» («Р» ад 15.06.2007). Місіянэрская дзейнасьць Касьцёлу там параўноўваецца з крыжовымі паходамі, а Папа Ян Павал II, пісала газэта, «ужо ў якасьці «намесьніка Бога на Зямлі» супрацоўнічаў з шэфам ЦРУ, г.зн. займаўся ня проста зямнымі, а нізьменнымі, так бы мовіць, д’ябальскімі справамі». У адказ Саюз палякаў Беларусі запатрабаваў прыцягнуць да адказнасьці галоўнага рэдактара газэты Анатоля Лемяшонка і журналіста Антона Андрэенку паводле арт. 130 КК: «Распальваньне расавай, нацыянальнай альбо рэлігійнай варожасьці».

### Новы пасол Вялікай Брытаніі

Новым надзвычайным і паўнамоцным пасломВялікай Брытаніі ў Беларусі будзе Майкл Хэдак — кар’ерны дыплямат, які працаваў у Швайцарыі, Кувэйце, Сірыі, Чэхіі і Расеі.

### Парлямэнт захаваў разьмеркаваньне

Прыняты палатай прадстаўнікоў законапраект аб вышэйшай адукацыі захоўвае сыстэму разьмеркаваньня для выпускнікоў ВНУ. Яны абавязаныя адпрацоўваць два гады. Пры няяўцы выпускнік кампэнсуе выдаткі на навучаньне. Дыплём магістра не ратуе ад разьмеркаваньня.

**Паводле БелаПАН, www.baj.ru, БелТА**

# Дзень Быкава

19 чэрвеня Васілю Быкаву, Народнаму пісьменьніку, франтавіку і змагару за незалежнасьць Беларусі споўнілася б 83 гады. Па яго кніжках сьвет дазнаваўся пра беларускую літаратуру. Ён быў кандыдатам на Нобэля, неаспрэчным маральным аўтарытэтам. Яго вяртаньне з-за мяжы, скон і шматтысячная маніфэстацыя, у якую вылілася пахаваньне, сталі легендай нашых дзён. У дзень нараджэньня Васіля Быкава людзі зьбіраліся разам, каб успомніць яго.


ЮЛІЯ ДАРАШКЕВІЧ

**Пасол Ізраілю Зэеў Бэн-Ар'е, перакладчык «Бедных людзей» Быкава, з кветкамі ля магілы пісьменьніка.**

## Над Васілём сьпявалі гімны

А 18-й на Ўсходніх могілках, дзе пахаваны Васіль Быкаў, было каля сотні чалавек. Колькі хвілін пачакалі: падыходзіла моладзь з кветкамі, бел-чырвона-белымі стужкамі. Над грамадою — там, дзе стаялі маладафронтаўцы, — лунаў бел-чырвона-белы сьцяг.

Сябра Васіля Быкава, пісьменьнік Валянцін Тарас ад імя Беларускага ПЭН-цэнтру пачаў імпрэзу, запрасіўшы ўсіх выходзіць і ўспамінаць Народнага пісьменьніка.

Генадзь Бураўкін казаў, што ня хоча ў гэты дзень думаць, што Быкава няма: «Наадварот, 83 гады таму Быкаў прыйшоў у Беларусь і назаўсёды з намі застанецца».

Пасол Ізраілю Зэеў бэн Ар'е прамаўляў па-беларуску. Ён падзяліўся прыемнай навіной: ізраільскі літаратурны часопіс хутка надрукуе «Бедных людзей» Быкава на іўрыце, сьціпла апусьціўшы той факт, што сам пераклаў твор на родную мову.

Акадэмік Радзім Гарэцкі ўспамінаў, што Быкаў першы паставіў пытаньне пра ўшанаваньне памяці ахвяраў сталінскіх рэпрэсій.

«Кожны час мае сваё сярэднявечча, — казаў ізноў Валянцін Тарас. — І цяпер якраз такі час нашага сярэднявечча, калі пануе інквізыцыя. Але мы жывыя, творчасьць Быкава жывая... Сёньня ў літаратуры ёсьць дзьве лініі: лінія Сталіна-Чаргінца і лінія Быкава-Адамовіча і ўсіх нас. Я не сумняюся, што ўрэшце лінія Сталіна апынецца там, дзе ёй належыць быць».

Ірына Міхайлаўна Быкава падзякавала ўсім, хто прыйшоў успомніць пісьменьніка.

На адыход прысутныя прасьпявалі гімны «Магутны Божа» ды «Не загаснуць зоркі ў небе».

**Сямён Печанко**

## «Чакаю гэты дзень, каб пагаварыць з вамі»

У вушацкую вёску Бычкі, на радзіму Быкава, людзі зьехаліся зь Менску, Полацку і Наваполацку, Віцебску, Шаркаўшчыны. Былі Аляксандар Мілінкевіч зь Інай Кулей, Вінцук Вячорка, Павал Севярынец, Уладзімер Арлоў, Сяргей Законьнікаў, Вольга Іпатава, Ірына Жарнасек. Праз праблемы са здароўем ня змог быць Рыгор Барадулін, ён нават ня змог прыйсьці на Ўсходнія могілкі. Затое прыехала сястра Быкава Валянціна: уцякла з наваполацкага шпіталю, каб патрапіць на сьвяткаваньне. Прыйшло шмат аднавяскоўцаў Быкава. Імпрэзу ж арганізавала краязнаўца Ада Райчонак.

Сядзібу-музэй паставілі на месцы хаты Быкавых. «Канечне, зрабілі падобна, але зусім ня тое, — кажа сястра пісьменьніка. — Гэтая ж хата халодная, ніхто ў ёй жыць ня зможа. Моху між бярвеньня няма. Са старых рэчаў засталіся толькі два ложкі. Усё іншае ўжо не адсюль».

У хаце некалькі партрэтаў Быкава. Стаіць фатаздымак, які несьлі перад калёнай падчас пахаваньня Народнага пісьменьніка. Гартаю кнігу гасьцей музэю. Адзін з апошніх запісаў: «Дзякуй ад байцоў спэцназу МУС». Ніхто з раённага начальства не адзначыўся.

Імпрэза пачалася проста на падворку. Паэт Сяргей Законьнікаў расказаў, як быў ва Ўкраіне ў вёсцы Севярынаўка, дзе імя Васіля Быкава напісанае на брацкай магіле. У Севярынаўцы ёсьць вуліца імя Быкава. У Менску, Вушачах, іншых гарадах Беларусі такіх вуліц яшчэ няма.

А.Мілінкевіч заявіў, што рух «За Свабоду» заснаваў прэмію імя Быкава. Ляўрэатамі будуць людзі, «якія працавалі над умацаваньнем беларускага духу, дзякуючы каму людзі выходзяць на Плошчу».

Валянціна Быкава казала, што брат сапраўды пачынаў пісаць вершы, але не пайшло. Расказвала, як з фронту прыйшла «пахаронка», колькі яны з маці плакалі, пакуль не разабраліся, што «пахаронка» датуецца ранейшым числом, чым нядаўні ліст Васіля. «Чакаю штогод гэты дзень, каб вы прыехалі сюды, каб пагаварыць з вамі», — спадарыня Валянціна не хавала сьлёз.

Імпрэза ля музэю перацякла ў сяброўскую бяседу ля старой вясковай школы, дзе некалі вучыўся Быкаў. Гэты будынак не перараблялі і яго сьцены сапраўды помняць Быкава.

**Зьміцер Панкавец, Бычкі – Менск**

# Дажынкі пад пагрозай

Рэкордна гарачае і сухое лета наносіць удар па ўраджаі.

Тэма ўплыву экстрэмальнага надвор’я на будучы ўраджай уздымаецца ў апошнім нумары «Советской Белоруссии». У артыкуле «Сухой счёт» вядзецца пра надзвычайнае становішча ў Гомельскіх гаспадарках. У іх, паводле апошніх дадзеных абласнога камітэту па сельскай гаспадарцы і харчаваньні, пашкоджана каля 60 тысячаў гектараў зерневых (20% усіх плошчаў), зь якіх чвэрць загінула. З-за недахопу вільгаці пацярпела больш за палову раёнаў вобласьці. Практычна ўсё Палесьсе апынулася пад пагрозай страты ўраджаю. Ёсьць гаспадаркі, дзе паша выгарэла цалкам. На Гомельшчыне сохне нават кукуруза, устойлівая да сушы культура. Тым ня менш, нельга казаць пра магчымы недабор ураджаю, прыводзіць газэта словы старшыні камітэту Леаніда Мальчука.

«СБ» таксама падае меркаваньне супрацоўнікаў Навукова-практычнага цэнтру па земляробстве НАН Беларусі, па зьвестках якіх страты ўраджаю зерневых ад сушы складаюць 5-7%. Найменш пацярпелі пасевы на Берасьцейшчыне, Віцебшчыне і Магілёўшчыне.

Варта адзначыць, што ў неафіцыйных гутарках навукоўцы куды менш аптымістычныя: паводле разьлікаў, калі ўстойліва сухое надвор’е захаваецца цягам некалькіх тыдняў, у Беларусі можа паўтарыцца неўраджай 1999 г. Тады атрымалі 3,6 млн. т зерня, што стала прычынай адмены сьвяткаваньня «Дажынак» у Шклове.

Пра магчымы недабор ураджаю піша газэта «Белорусы и рынок». У якасьці доказу прыводзіцца той факт, што адказныя чыноўнікі, кажучы пра заплянаваныя паказчыкі, увесь час зьвязваюць рэалістычнасьць іх выкананьня з надвор’ем.

Выданьне зьвязвае асьцярожнасьць чыноўнікаў з сытуацыяй у нашых суседзяў. На поўдні Украіны і Расеі склалася надзвычайная сытуацыя. Ва Ўкраіне яна запатрабавала тэрміновых захадаў ураду. Праз капрызы надвор’я наша паўднёвая суседка мусіць сёлета закупіць каля 700 тыс.т зерня. Прычым плянуецца закупка ня толькі пшаніцы, але й фуражнага ячменю і кукурузы.

У пацярпелых ад сушы расейскіх рэгіёнах чакаецца зьніжэньне ўраджайнасьці на 30%. Сёлетні недабор зерневых прывядзе да росту імпарту мяса і ўздыму інфляцыі, прагназуе Інстытут кан’юнктуры аграрных рынкаў.

**Сямён Печанко**

# Прэм’ер-міністар заявіў аб правале замежнагандлёвых паказчыкаў

«Калі мы ў нечым памыліліся, то сытуацыю трэба карэктаваць», — заявіў прэм’ер-міністар Сяргей Сідорскі, камэнтуючы 19 чэрвеня на паседжаньні Савету міністраў невыкананьне паказчыка па дасягненьні станоўчага сальда ў замежным гандлі.

Паводле слоў Сідорскага, «правал гэтага паказчыка шмат у чым абясцэніў іншыя дасягненьні эканомікі за студзень-травень гэтага году». «Мы ня толькі не змаглі дасягнуць станоўчага сальда, але і дапусьцілі перавышэньне тэмпаў росту імпарту над тэмпамі росту экспарту ў два разы», — зазначыў прэм’ер.

Паводле Мінстату, у студзені-красавіку сальда замежнага гандлю таварамі і паслугамі склалася адмоўнае ў памеры $742 млн, у тым ліку таварамі — адмоўнае ($1127 млн), паслугамі — станоўчае ($385 млн). Паводле Нацбанку, аб’ём замежнага гандлю таварамі і паслугамі за студзень-красавік склаў $15 млрд 638 млн, у тым ліку экспарт — $7 млрд 448 млн, імпарт — 8 млрд 189 млн. У адносінах да леташняга пэрыяду аб’ём гандлю таварамі і паслугамі склаў 116,9%, экспарт — 111,6%, імпарт — 122,1%.

**Паводле БелаПАН**

# Цягам году мусяць прыватызаваць цэмэнтныя заводы

А таксама Гарадзенскую тытунёвую фабрыку і шэраг драбнейшых прадпрыемстваў.

Дзяржаўны камітэт па маёмасьці плянуе цягам 2007 г. акцыянаваць 7 прадпрыемстваў. Тры зь іх уяўляюць для айчыннай эканомікі важнае значэньне. Гэта Беларускі цэмэнтавы завод, Крычаўскі цэмэнтна-шыфэрны завод і Гарадзенская тытунёвая фабрыка. Пералік прадпрыемстваў, што маюць прыватызаваць у бягучым годзе, замацаваны пастановай Дзяржкамітэту па маёмасьці №30 ад 28 траўня 2007 г. У мінулым годзе зь дзевяці заплянаваных да продажу зьмянілі статус толькі чатыры прадпрыемствы.

Міністар архітэктуры і будаўніцтва Аляксандар Селязьнёў паведаміў, што Беларускі цэмэнтавы завод будзе прыватызаваны ў бліжэйшы час. На першым этапе дзяржаўны ўдзел у акцыянэрным капітале прадпрыемства будзе складаць 100%. Стандартная працэдура акцыянаваньня займае каля паўгоду, аднак на патрабаваньне ўраду працэс можа завершыцца ў больш кароткія тэрміны. Беларускімі цэмэнтнымі заводамі цікавяцца інвэстары з Ірану, Кіпру, Аўстрыі ды Эгіпту.

Гарадзенская тытунёвая фабрыка ўнесеная ў сьпіс прадпрыемстваў, рэфармаваць якія плянуецца да канца году. Аднак незалежныя экспэрты ў гэтым пытаньні больш асьцярожныя.

**СП, паводле «Белорусы и рынок»**



АНДРЭЙ ЛЯНКЕВІЧ

**17 чэрвеня тысяча эвангелісцкіх цэркваў Беларусі малілася за свабоду сумленьня.**

### 14 чэрвеня

#### Казуліна пазбавілі сустрэчы зь сям'ёй

Палітвязьня **Аляксандра Казуліна** пазбавілі права на кароткатэрміновую сустрэчу зь сям'ёй, што мусіла адбыцца ўлетку. Нагодай стала нібыта парушэньне вязьнем дысцыпліны. Сваякі валодаюць інфармацыяй, што яго зьбіраюцца перавесьці ў менскі турэмны шпіталь.

#### Арыштавалі кіраўніка Шклоўскага БНФ

**Аляксандра Фёдарава,** кіраўніка Шклоўскай гарадзкой арганізацыі Партыі БНФ, арыштавалі па абвінавачаньні ў атрыманьні заробку за «нябожчыка». У той жа дзень у хаце Фёдарава міліцыянты ўчыніліператрус. А Фёдараў быў зьмешчаны ў камэру часовага затрыманьня.

### 15 чэрвеня

#### Дашкевіч адседзеў палову тэрміну

15 чэрвеня мінула палова тэрміну зьняволеньня **Зьмітра Дашкевіча**. З гэтай нагоды незарэгістраваны «Малады фронт» расклеіў уначы ў Менску дзясяткі партрэтаў палітвязьня з патрабаваньнем яго вызваленьня.

Зьміцер адбывае пакараньне ў шклоўскай калёніі.

#### Шацікаву і Ігнатовіча аштрафавалі

У Віцебску актывістку **Крысьціну Шацікаву** пакаралі штрафам у памеры 21 базавай велічыні (651 тыс. рублёў). Судзьдзя Першамайскага суду Віцебску **Валянціна Кісьмярошкіна** прад'явіла ёй абвінавачваньне адразу па двух артыкулах КаАП: непадпарадкаваньне супрацоўнікам міліцыі і ўдзел у несанкцыянаваным пікетаваньні. У Менску аштрафаваны сябра Партыі БНФ **Андрусь Ігнатовіч**. Суд Фрунзенскага раёну Менску прызнаў А. Ігнатовіча вінаватым у расклейваньні ўлётак з заклікам узяць удзел у мітынгу 26 красавіка. Паводле ч. 1 арт. 23.24 КаАП РБ (парушэньне ўсталяванага парадку арганізацыі й правядзеньня мітынгаў), Ігнатовіча аштрафавалі на 15 базавых велічыняў (465000 беларускіх рублёў).

#### У Горадні ўсталявалі слуп памяці

На месцы разбуранага будынку па вул. Горкага, 29, актывісты дэмакратычнага руху ўсталявалі слуп з фотаздымкам і шыльдай з надпісам: «Жылы дом. Помнік архітэктуры канструктывізму. 1936 — 6.X.2006. Трагічна загінуў».Такіх дамоў у Горадні дзесяць, а па ўсёй Беларусі — каля сотні.

#### Забаранілі пікет

Менгарвыканкам забараніў пікет супраць адмены льготаў. Заяўнікамі выступілі сябры Партыі БНФ **Андрусь Ігнатовіч** і **Сяржук Семянюк**. Пікет меркавалі правесьці 21 чэрвеня ў раёне вул.Харужай і Куйбышава з 16.00 па 20.00. Адмова грунтуецца на тым, што «правядзеньне акцыі будзе ствараць нязручнасьці пешаходам і руху транспарту».

### 16 чэрвеня

#### Саюз палякаў судзіцца з «Рэспублікай»

**Саюз палякаў Беларусі** патрабуе прыцягнуць да крымінальнай адказнасьці галоўнага рэдактара газэты «Рэспубліка» **Анатоля Лемяшонка** і аўтара гэтага выданьня **Антона Андрэенку**.

У заяве, накіраванай у Генпракуратуру, Рада СПБ выказвае меркаваньне, што, апублікаваўшы і распаўсюдзіўшы на тэрыторыі Беларусі артыкул **«Новыя крыжаносцы»**, рэдактар і аўтар газэты зьдзейсьнілі злачынства, пакараньне за якое прадугледжвае арт.130 КК — «Распальваньне расавай, нацыянальнай альбо рэлігійнай варожасьці».

### 17 чэрвеня

#### Супольная малітва пратэстантаў

У нядзелю адбылася супольная малітва ў пратэстанцкіх цэрквах. Яна ахапіла больш за 10 тысячаў вернікаў і адбывалася адначасова ў тысячы памесных цэркваў па ўсёй Беларусі. Малітве папярэднічаў трохдзённы пост. Мэта акцыі — прыцягнуць увагу да парушэньня ўладамі правоў рэлігійных меншасьцяў.

### 18 чэрвеня

#### Тацяну Севярынец не аднавілі на працы

Судзьдзя Першамайскага раённага суду **Тацяна Родзіна** адхіліла пазоў **Т.Севярынец** да Аддзелу адукацыі Першамайскага раёну Віцебску. Спн.Тацяна зьбіраецца падаваць касацыйную скаргу і новы пазоў у суд вышэйшай інстанцыі. Т.Севярынец імкнецца праз суд аднавіцца на працы. Яе звольнілі зь сярэдняй школы №40 нібыта за прагулы.

#### Рэгістрацыя Руху «За свабоду»

Лідэр «Руху «За свабоду» **Аляксандар Мілінкевіч** падаў заяўку ў Міністэрства юстыцыі на рэгістрацыю Рэспубліканскага праваабарончага грамадзкага аб'яднаньня «Рух «За Свабоду».

#### У Клецку прыкрылі палітычную справу

Заведзеная 13 траўня супраць клецкага актывіста **Сяргея Панамарова** крымінальная справа паводле ч.2 арт. 188 (паклёп у друкаваных сродках) спыненая з-за адсутнасьці складу злачынства. Нагодай для справы стала нататка ў газэце «Бойкі Клецк», якую С.Панамароў выдае ўласнымі сродкамі. У адным з артыкулаў вялося пра тое, як кіраўнічка Клецкай юрыдычнай кансультацыі **Натальля Семашкевіч** адсудзіла ва ўласнага бацькі маёмасьць ды пазбавіла яго бацькоўскіх правоў на малодшую дачку.

#### Вызваліць Рыту Царан

Больш за сто студэнтаў Гарадзенскага ліцэю і Гарадзенскага дзяржунівэрсытэту падпісаліся пад лістом з просьбай вызваліць **Маргарыту Царан**. 20-гадовую дзяўчыну асудзілі на чатыры гады зьняволеньня за набыцьцё 0,28 гр марыхуаны. Падпісанты лічаць, што прысуд студэнтцы несправядлівы, а крымінальная справа супраць яе — вынік памылкі альбо правакацыі.

### 19 чэрвеня

#### Справу Лукашова перанесьлі на 9 ліпеня

19 чэрвеня судзьдзя Ленінскага раёну Менску **Т.Жулкоўская** мусіла пачаць паўторна разглядаць справу **Кастуся Лукашова**, брата Вячаслава Сіўчыка, аднак працэс не адбыўся. На суд не зьявіўся пацярпелы ўчастковы **Сушчэня**, ён да 5 ліпеня знаходзіцца ў камандзіроўцы. Справу К.Лукашова перанесьлі на 9 ліпеня. 20 лютага суд пакараў Лукашова зьняволеньнем на 2 гады з адтэрміноўкай выкананьня прысуду на 2 гады. Кастуся прызналі вінаватым у парушэньні арт.364 КК (Супраціў міліцыі). У красавіку Калегія Менскага гарадзкога суду адмяніла прыгавор К.Лукашову.

#### Фінькевіча пераводзяць у Шклоў

Актывіста незарэгістраванага «Маладога фронту» **Артура Фінькевіча** звальняюць з працы ў магілёўскім дзіцячым садку, дзе ён рабіў дворнікам, і пераводзяць у Шклоў, на будаўніцтва папяровай фабрыкі. Нагадаем, што Фінькевіч быў асуджаны за ўдзел у незарэгістраванай арганізацыі.

**СП**

# Капітальны рамонт

Піша **Віталь Тарас.**

У швэдзкага пісьменьніка Пэра Лягэрквіста ёсьць апавяданьне — нібыта, пра рамонт. У доме ўвесь час нешта габлююць, фарбуюць, клеяць шпалеры, перасьцілаюць падлогу, разьбіраюць столь. І ўсё бліжэй чуваць грукат малаткоў... На самым канцы апавяданьня разумееш, што гэта сымбалічнае апісаньне жыцьця чалавека.

У сёньняшняй Беларусі жыцьцё гарадзкога чалавека, без усялякай сымболікі й перабольшваньняў, ёсьць суцэльным пэрманэнтным рамонтам.

## «Зараз дапалім»

Напрыклад, возьмем дом, у якім жыве мая сям'я. Даўным-даўно, гады чатыры таму нам паведамілі, што ў доме будзе капітальны рамонт...

Кожны савецкі чалавек ведае, што адзін рамонт роўны двум пажарам і чатыром паводкам.

Праўда, за савецкім часам сам гэты панятак нейкі час быў ахутаны флёрам рамантызму. Так, знакаміты раман Леаніда Собалева (ён узначальваў Саюз Пісьменьнікаў СССР, памёр у 1971 г.) называўся «Капітальны рамонт». Раман, які выйшаў у 1933-м, быў прысьвечаны жыцьцю дарэвалюцыйнага царскага флёту. Галоўная патасная ідэя раману, які горача падтрымаў галоўны пралетарскі пісьменьнік Горкі і які потым вывучалі ў ВНУ з гуманітарным ухілам, была простай — да рэвалюцыі жыцьцё, асабліва на флёце, было жахлівым і бесчалавечным. Ня тое што ў гады першых сталінскіх пяцігодак.

Праўда, за гады сацыялізму й постсавецкай рэчаіснасьці на тэму рамонту й рамонтнікаў нарадзілася безьліч нерамантычных анэкдотаў. Вось адзін зь іх. Жанчына знайшла брыгаду рамонтнікаў і прывяла іх дахаты, каб яны паглядзелі, колькі ён зойме часу. Брыгадзір запэўнівае — ну, тут працы на пару гадзінаў. Добра, — узрадвалася жанчына. Тады я пайду ў цырульню, а вы тут працуйце. Вяртаецца праз чатыры гадзіны — рабочыя сядзяць на кухні, паляць. «Так, — кажа гаспадыня. — Я паеду на выходныя да маці, а вы тут да панядзелка ўсё каб зрабілі!» «Дык зараз дапалім і зробім», — кажа брыгадзір. У панядзелак тая ж карціна: сядзяць, паляць. «Ну што ж! Я на месяц еду ў адпачынак. Каб да майго прыезду ўсё было зроблена!» — патрабуе гаспадыня. «Зараз дапалім і зробім», — абяцае брыгадзір. Вяртаецца гаспадыня з адпачынку. У кватэры конь не валяўся. Рабочыя сядзяць паляць. «Ішлі б вы адсюль...!» — не вытрымлівае жанчына. «Зараз дапалім і пойдзем».

Але што ж, калі пад капітальным рамонтам разумець рэвалюцыйныя пераўтварэньні й разбурэньні, дык гэтыя якасьці цалкам адпавядаюць панятку і ў наш час. Асабліва калі размова йдзе пра капітальны рамонт без высяленьня. Вось пад такі мы й патрапілі.

> Гаспадарамі жыцьця адчуваюць сябе яны — тыя, хто зрабіў з нашага гораду муляж эпохі разьвітога сацыялізму.

Праўда, адразу пасьля таго як ЖЭС паведаміў жыльцам пра рамонт, нічога асаблівага не адбывалася. Ішлі гады, мы пасьпелі самі памяняць вокны, адгабляваць падлогу, паклеіць шпалеры, паставіць новую сантэхніку. Насупраць нас пабудавалі новы дом.

Першымі прыйшлі электрыкі. Потым, пакуль мы былі ў ад'езьдзе, прыйшлі дахоўшчыкі й памянялі бляху. Усё было цудоўна. Аж пакуль не прыйшлі сантэхнікі і не паздымалі ўнітазы, каб памяняць заіржаўленыя за дзесяцігодзьдзі каналізацыйныя трубы. Абяцалі, што пацярпець давядзецца дні дватры. Цярпеньне расьцягнулася на тры тыдні.

Цяпер мы ведаем, што галоўная перавага жытла ў цэнтры сталіцы — гэта, па-першае, блізкасьць грамадзкай прыбіральні. І падругое, магчымасьць заскочыць у госьці на хвілінку да сваякоў ці знаёмых. Горш, калі знаёмыя ў момант капрамонту заходзяць у госьці да вас. Ды яшчэ зь півам.

## Гіпсакартоншчыкі

Ну, да ўсяго ж прывыкае чалавек. Прывыклі да цыстэрнаў з вадой у двары. Да частых адлучэньняў электрычнасьці. Да адсутнасьці то гарачай, то халоднай вады (і ня толькі, як ні дзіўна, падчас капрамонту). Да непазбыўных сьлядоў фарбы й пабелкі на ўсім, да заўсёднага пылу ад бітай цэглы ды шчабёнкі ў паветры. Ды што тут распавядаць? Кожны сам на сабе ўсё гэта калісьці ды зьведаў. Альбо зьведае.

Ну вось, пасьля сантэхнікаў, месяцы праз два, прыйшлі муляры. Потым, яшчэ празь месяц, сталяры й цесьляры. Потым гіпсакартоншчыкі. (Тэхналёгія, у тым ліку і будаўнічая, на месцы не стаіць.)

Сярод майстроў былі розныя людзі. Пераважна сумленныя. Усе працавітыя. Часам непунктуальныя: маглі дамовіцца на гадзіну дня ў панядзелак, а прыйсьці а шостай увечары ў пятніцу.

Але суседзі з суседняга дому лічылі, што нам страшэнна пашэнціла, — ім трапілася брыгада, у якой усе пілі. Канечне, і сярод нашых знаёмых рамонтнікаў ня ўсе былі цьвярэзьнікі. Але так напіцца, каб упусьціць разводныя ключы ў дзірку на чацьвёртым паверсе і шукаць іх у падвале, ці забыцца на свой інструмэнт — такога амаль не было.

А яшчэ я зразумеў, што пры такой колькасьці брыгадзіраў, майстроў, падмайстроў, памочнікаў, вучняў і кантралёраў, якія займаюцца рамонтам, альбо правяраюць чужую працу, беспрацоўе беларусам не пагражае.

Некалі прачытаў, што мэрыя Токіё час ад часу мяняе плітку на ходніках — ружовую на жоўтую, жоўтую — на фіялетавую і г.д. І ўсё для таго, каб вырашыць праблему занятасьці сярод гараджанаў. Мэрыя Менску, відаць, таксама гэтым заклапочаная. Да рознакаляровай пліткі яшчэ не

дайшло, але тое, што плітка й бардзюры мяняюцца ўвесь час, — гэта факт. Прычым мяняюцца. як цяпер кажуць, кропкава. Сёньня там паклалі асфальтавую латку, там падраўнялі, там падфарбавалі. заўтра — у іншым мейсцы. Пазаўтра зноў кладуць асфальт на тым самым месцы, што й раней. А ў выніку ні праехаць, ні прайсьці.

Замест пэрманэнтнай рэвалюцыі — пэрманэнтны рамонт. Усе пры справе. І воку эстэтычна прыемна.

Праўда, з усіх сучасных тэхналёгіяў улады, мне падаецца, аддаюць перавагу адной — гіпсакардону. Ня толькі адрэстаўраваныя дамы, але й новыя, якіх набудавана ўжо шмат, у большасьці падаюцца мне чамусьці нейкімі гіпсакардоннымі, альбо муляжнымі. Нейкія расфарбаваныя дэкарацыі замест гораду. Дый дэкарацыі нейкія састарэлыя, зь мінулага часу, часу «Капітальнага рамонту» Собалева.

Усе дэталі й дэталькі сталінскага ампіру — рознага роду алегарычныя фігуры, як на Палацы прафсаюзаў, галубы з галінкамі ў дзюбах, надпісы «Сталін», само сабой — усё любоўна рэстаўруецца, з дэкору й ляпніны 40-50-х гадоў ледзьве не пылінкі зьдзьмухваюцца. А між тым, сапраўдных старадаўніх камяніцаў — тых самых, што вызначаюць аблічча гораду, становіцца ў Менску, дзе без таго шмат чаго парушана, усё меней. Пра будынак Бэрнардынскага кляштару ня буду тут казаць. Гэта іншая тэма, даўно і ня мною распачатая.

Я пра псыхалёгію капрамонту. Не пра тых, хто ім займаецца, хто выбівае каштарысы і будматэрыялы, хто сумленна зарабляе сабе на хлеб, а пра нас, якія звыклі жыць у гэтым гармідары. Прывыклі, што ў любую хвіліну да нас у кватэру могуць уваліцца цьвярозыя, ці ня вельмі (у залежнасьці ад часу дня) работнікі ў зашмальцаванай спэцвопратцы ды пачаць нешта разьвінчваць, раскурочваць, развальваць, а потым сысьці, не прыбраўшы за сабой. Прывыклі чакаць — калі нам дадуць сьвятло, ваду, цяпло. Калі нам дазволяць (ці, хутчэй, не дазволяць) усталяваць сваю спадарожнікавую антэну альбо кандыцыянэр, памяняць вокны на шклопакеты. Карацей кажучы — калі нам дазволяць жыць у нашых прыватызаваных кватэрах як гаспадарам? У тым і справа, што гаспадарамі жыцьця адчуваюць сябе яны — тыя, хто зрабіў з нашага гораду муляж эпохі разьвітога сацыялізму.

У нашым пад’езьдзе нядаўна ў чарговы раз пачалі бяліць столі ды фарбаваць сьцены. Дзякаваць Богу, фарба гэтым разам хоць не традыцыйнага атрутна-зялёнага колеру. Відаць, уся, разам з чырвонай, пайшла на афіцыйную сымболіку.




**Выходнымі мэр Масквы Юры Лужкоў мэр Менску Міхаіл Паўлаў змацавалі шампанскім гешэфт: да восені 2008 маскоўскія будаўнічыя фірмы збудуюць у Менску «Дом Масквы» і 25-павярховы мікрараён.**

# Што мяняць спачатку: начальства ці сьцяг?

Такая спрэчка ўсчалася між беларусамі й літоўцамі падчас сумеснай вандроўкі па Вяльлі, па сьлядох экспэдыцыі графа К.Тышкевіча. Піша **Людвіка Кардзіс**.

17 чэрвеня на тэрыторыю Літоўскай Рэспублікі прыплыла падарожная выправа па рацэ Вяльлі. Гэта экспэдыцыя наладжаная ў гонар 150-х угодкаў экспэдыцыі графа К.Тышкевіча па Вяльлі. Вяльля і яе берагі — для мяне таксама дарагія мясьціны. Гэта мая радзіма. Тут я ня раз хадзіла ў краязнаўчыя вандроўкі зь сябрамі. Мы шукалі гару Замкоўку (цяпер Астравеччына), пячоры насупраць вёскі Скерсабалі, пра якія пісаў яшчэ Тышкевіч. Таму я з падвойнай цікавасьцю паехала сустрэць гэтую экспэдыцыю.

Да Буйвідзяў мы дабраліся без прыгод, агледзелі вёску, мясцовы касьцёл. Распыталіся ў мясцовых, як праехаць да Вяльлі. Нам патлумачылі дарогу на добрай беларускай мове, і мы паехалі да месца сустрэчы.

Першым расчараваньнем быў фірмовы блакітны сьцяжок, на якім было напісана «Вилия-Neris». Зьдзівіла форма «Вилия» — на якой гэта мове? Па-беларуску? Па-польску? Бо ў польскай мове ва ўсіх словах націск ставіцца на другі галосны з канца. Таму яны гавораць і пішуць «Wilija». А беларусы сваю рэчку называюць Вяльля, націск на апошняе «я». А яшчэ зьдзівіла, што ў слове Вилия адно «і» было напісана па-расейску, другое — па-беларуску. Што-што, а ўжо сёньня ў Вільні даведацца, як пішацца па-беларуску маленькае слова, — дакладна не праблема.

Але пакінем убаку філялягічныя спрэчкі — у нас добры настрой, мы сустракаем сяброў і ставім сьцягі: чырвоны з Пагоняю і бел-чырвона-белы. Усё б добра, ды тут пачаўся дэтэктыў: да нас адразу падышоў староста вясковай самаўправы: «Ці не зашкодзіць гэта справе?» Такое пытаньне нас зьдзівіла. У незалежнай Літве чалавек вольны і мае права свабодна выказваць свае думкі. Пад бел-чырвона-белым сьцягам мы ў 1990-я тут, у Вільні, дапамагалі літоўцам у барацьбе за незалежнасьць. Але староста, чалавек ужо немалады, усё ж зрабіў тэлефонны званок сябру польскай фракцыі ў літоўскім сэйме. Той не знайшоў нічога дрэннага ў нашым учынку.

Наш прыклад не застаўся незаўважаным — побач зьявіліся літоўскі трохкалёр і сьцяг Віленскага раёну.

Нам не было нудна, пакуль мы чакалі ўдзельнікаў экспэдыцыі: мы пазнаёміліся зь мясцовымі людзьмі, арганізатарамі воднай выправы і ўдзельнікамі, якія далучацца ўжо на літоўскім баку.

Пад 16-ю гадзіну пачалі падцягвацца вясковыя. «У вёсцы гэта падзея, — тлумачаць нам. – Даўно не было ніякіх імпрэзаў».

Загучала музыка. Усялякая: беларуская, літоўская і нават «падмаскоўныя вечары». Калі ўрэшце паказаліся нашы героі, радасьць была ўсеагульная. Але дэтэктыў са сьцягамі працягваўся: калі да берагу прыстаў першы плыт, у імгненьне воку зь яго выскачыў мужчына, вырваў наш бел-чырвона-белы сьцяг і даўся праз кусты. На нейкі момант мы анямелі. Але хутка ачомаліся і кінуліся ў пагоню. Як ні дзіўна, гэта аказаўся адзін зь літоўскіх падарожнікаў. Ён патлумачыў свой учынак тым, што сярод удзельнікаў ёсьць два прадстаўнікі беларускай улады. Нашы тлумачэньні, што мы грамадзяне Літвы і маем права выказваць свае думкі, нават калі яны супярэчаць беларускай уладзе, ня мелі плёну. Мы забралі сьцяг і паставілі яго воддаль, на гары. Пазьней мясцовыя хлопцы добра яго замацавалі, і сярод многіх падарожнікаў і буйвідзянцаў нашы сьцягі карысталіся папулярнасьцю і пашанай. Шмат хто фатаграфаваўся на іх фоне.

Але спрэчка з тым чалавекам, што вырваў наш сьцяг, ня скончылася. Узяўшы ў падмогу кабетку, ён яшчэ раз спрабаваў нас пераканаць, але тут нас падтрымалі літоўцы. Адзін з тых, хто нам дапамагаў, дарэчы, тлумачыў нашым дзецям, як яшчэ ў 1950-я гады літоўская моладзь выступала суп-



**Вандроўнікі ў ваколіцах Залесься Агінскага (Смургоншчына).**

**5 чэрвеня 2007 г. спаўняецца 150 гадоў з часу экспэдыцыі графа Канстанціна Тышкевіча па Вяльлі. Падчас яе Тышкевіч упершыню наведаў, абмерыў і апісаў вытокі й першыя 77 кілямэтраў ракі. З пагляду геаграфіі, гісторыі, этнаграфіі, былі вывучаная Вялейшчына й Віленшчына. Вынікі экспэдыцыі выйшлі кнігай «Вяльля і яе берагі» (1871 г.). Гэта адзіная манаграфія ў Эўропе, дзе этнічны рэгіён дасьледаваны шляхам падарожжа па рацэ.**

**Група энтузіястаў вырашыла паўтарыць падарожжа графа. Карыстаючыся сучаснымі тэхналёгіямі, у часе экспэдыцыі плянуецца фіксаваць зьмены на берагах Вяльлі. Пачалася гэта беларуска–літоўская экспэдыцыя 5 чэрвеня з адкрыцьця помніка ў гонар К.Тышкевіча ў вёсцы Камена. У складзе экспэдыцыі навукоўцы, мастакі, энтузіясты.**

**Шлях да беларуска–літоўскай мяжы экспэдыцыя праплыла за два тыдні з начлегамі ў Смургонях, Данішаве, Жодзішках. Праплываючы Літвою, удзельнікі экспэдыцыі зьбіраюцца ўшанаваць міталягічныя мясьціны Сантаку, Рэву, Пашульнішкі. Начлегі ў Літве заплянаваныя ў Судэрве, Дукштах, Кернаве, Руклі.**

**Купальле, як і 150 гадоў таму, будзе адсьвяткавана ў Вільні, насупраць парку Зьвярынец. Таксама вандроўнікаў прымуць у мэрыі. А скончыцца экспэдыцыя ў Коўне.**

раць савецкай улады. Ён распавядаў пра свайго брата, які быў паплечнікам Каланты. У рэшце рэшт, беларускі сьцяг мы ўсё-ткі абаранілі.

Пазьней, калі мы размаўлялі з нашымі сябрамі, удзельнікамі вандроўкі, яны распавядалі, што сьцяг пасьпелі разгледзець здалёк (мы не дарэмна стараліся: шасток, на якім вісеў сьцяг, быў досыць высокім). Яны дамовіліся, што як толькі ступяць на зямлю, засьпяваюць «Пагоню». Зьдзівіліся, падплыўшы, што няма сьцягу… На другім плыце літоўскія калегі вучылі сваіх беларускіх суседзяў: «Прыбярыце начальства, а пасьля мяняйце сьцяг». Але ж у Літве было наадварот: адразу сьцяг памянялі, а потым уладу. Начальства прыходзіць і сыходзіць. Сьцяг застаецца вечным.

Уся гэтая дэтэктыўная эпапея са сьцягамі навеяла не зусім сьвяточныя думкі. З самых высокіх трыбунаў чуваць дэклярацыі, што Літва хоча дапамагчы Беларусі стаць свабоднай, дэмакратычнай, эўрапейскай. Але ці атрымаецца гэта, калі кожны з нас, літоўскіх грамадзянаў, у вось такіх жыцьцёвых сытуацыях ня будзе кіравацца прынцыпамі свабоды, дэмакратычнасьці, эўрапейскасьці?

Ды хопіць тых сур’ёзных развагаў. Вяльля цячэ, сонца сьвеціць, экспэдыцыя плыве. А за падарожнікамі застаюцца лунаць на беразе сьцягі.

# Дзякуй

**П.Р., Аляксандру Ж., Віталю С., Вользе Р., А.С., Віталю С., Ігару С., Вікторыі Ш., Івану К., Марыі Г., А.Ш., Раісе Б., Аліне Ш., Натальлі Ц., Зьмітру Х., Ю.Б.** зь Менску.

**Віктару Л., Аляксандру К., Георгію С.** з Воршы.

**Аркадзю К.** з Івацэвіч.

**Канстанціну С.** з Горак.

**Віталю С.** з Гомеля.

**А.К.** з Чэрвеньскага раёну.

**Юр’ю М.** з Кармянскага раёну.

**Іне З., Міхаілу К.** з Жыткавіцкага раёну.

**Вікторыі К., Яўгену С.** зь Пінску.

**Уладзімеру Л.** з Смургонскага раёну.

**М.А., Уладзімеру Ц.** з Мазыра.

**Аляксандру Р.** з Навапалацку.

**Генадзю Ш.** з Барані.

**Аксане М., Н.Б., Сяргею З.** з Горадні.

**Уладзімеру В.** з Кобрыні.

**П.Г.** з Мастоў.

**Сяргею К.** са Слуцку.

**С.Р., Тамары Ш.** зь Бярозы.

**Андрэю Ч.** з Карэліч.

ПАВЕДАМЛЕНЬНЕ

ПВУП “Суродзічы”, УНП 190 786 828

МГД ААТ “Белінвестбанк”, вул. Калектарная, 11, Менск, код 764

Рахунак атрымальніка **3012 206 280 014** Асабовы рахунак

(прозьвішча, імя, імя па бацьку, адрас)

| Від аплаты | | | | Дата | Сума |
|---|---|---|---|---|---|
| За газэту "Наша Ніва" | | | | | |
| | | | | | |
| | | | | | |
| | | | | | |

Агулам

Касір

ПВУП “Суродзічы”, УНП 190 786 828

МГД ААТ “Белінвестбанк”, вул. Калектарная, 11, Менск, код 764

Рахунак атрымальніка **3012 206 280 014** Асабовы рахунак

(прозьвішча, імя, імя па бацьку, адрас)

| Від аплаты | | | | Дата | Сума |
|---|---|---|---|---|---|
| За газэту "Наша Ніва" | | | | | |
| | | | | | |
| | | | | | |
| | | | | | |

Агулам

КВІТАНЦЫЯ

Касір М.П.

## Каб штотыдзень атрымліваць газэту,

**дасылайце адрасы і грошы за газэту.**

1) Просім усіх ахвотных чытаць газэту **паведамляць у Рэдакцыю свае адрасы і тэлефоны. Гэта можна зрабіць праз:** тэлефоны: (017) 284-73-29, (029) 260-78-32 (МТС), (029) 618-54-84, e-mail: dastauka@tut.by, паштовы адрас: а/с 537, 220050 Менск.

2) **Просім у блянку банкаўскага паведамленьня ці паштовага перакazu дакладна і разборліва пазначайце адрас, у тым ліку паштовы індэкс і код пад’езду.**

Па пытаньнях атрыманьня газэты пытайцеся Рамана.

# Які твор беларускай

**Алег Гардзіенка, гісторык:** «Раман Эдуарда Самуйлёнка «Будучыня». Гэта цікавы прыгодніцкі раман пра падзеі 1920-х гадоў у Грузіі. Таксама хацелася б убачыць на экранах раман Кузьмы Чорнага «Трэцяя пакаленьне».

**Віктар Шалкевіч, бард, актор:** «Найперш трэба зьняць па матывах беларускіх казак мульцікі. Вы пачытайце «Анталёгію беларускіх казак», якія там сюжэты і героі! Зь іх маглі б атрымацца супэрскія мультфільмы, якія маглі б даць фору нават дыснэеўскім».

**Франц Сіўко, пісьменьнік:** «Раман Ірыны Жарнасек «Будзь воля Твая...» Таксама я б паставіў дакумэнтальны фільм паводле кнігі Гэрмана Кірылава «Гарт». Гэта твор пра знакавыя падзеі беларускай гісторыі. У ім расказваецца пра глыбоцка-пастаўскае пасьляваеннае падпольле».

**Даніла Жукоўскі, літаратурны крытык:** «У пісьменьніка Яраслава Пархуты ёсьць дакумэнтальная аповесьць «Адзінец» пра чалавека, які шмат гадоў хаваецца ў лесе ад НКВДыстаў. Здаецца, што было б добра экранізаваць менавіта яе. Таксама можна было зьняць фільмы на творы Вольгі Іпатавай».

**Максім Жбанкоў, кінакрытык:** «Мне б хацелася бачыць экранізацыю паводле Караткевічавых «Каласы пад сярпом тваім» ці «Хрыстос прызямліўся ў Гародні», бо фільм, які быў зьняты ў савецкія часы, не задавальняе практычна ва ўсіх аспэктах. Можна было зьняць фільм на гістарычныя творы Уладзімера Арлова. «Меч князя Вячкі» Леаніда Дайнэкі таксама падаецца кінэматаграфічным творам. Беларускае кіно трэба здымаць на тэксты, якія спрычыняліся б да росту нацыянальнай самасьвядомасьці».

**Сяргей Харэўскі, мастацтвазнаўца:** «У мяне нават не ўзьнікае пытаньняў — «Дамавікамэрон» Адама Глёбуса. Падобна на тое, што аўтар нават пісаў гэты твор з прыцэлам на экранізацыю. «Дамавікамэрон» напісаны сучаснай мовай, ёсьць зварот да культурных кодаў. Дынамічнае выкладаньне твору дазволіла б зьняць пазытыўны і пасьпяховы фільм у стылі экшн».

**Уладзімер Арлоў, пісьменьнік, гісторык:** «Каласы пад сярпом тваім». Таму што менавіта гэты твор канчаткова зрабіў мяне (ведаю, што ня толькі мяне) беларусам паводле сьветабачаньня, сьветаразуменьня і сьветаўяўленьня».

**Міхал Анемпадыстаў, мастак, рок-паэт:** «Зладзейскую трылёгію» Сяргея Пясэцкага. Гэтая літаратура напісаная папольску, але на менскім матэрыяле. Увогуле, усе творы Пясэцкага досыць кінэматаграфічныя, займальныя і захапляльныя. «Трылёгія» апавядае пра Менск да, падчас і пасьля рэвалюцыі. З такога фільму мы маглі б шмат чаго даведацца пра сваю гісторыю. Выйшаў бы такі беларускі «Ва-банк».

**Аляксандар Фядута, літаратурны крытык:** «Караткевіч. Даеш «Каласы пад сярпом тваім» і «Ладзьдзю роспачы»!

**Вінцук Вячорка, старшыня Партыі БНФ:** «Крывавы памол» Сержука Сокалава-Воюша. Гэта вельмі кінэматаграфічны твор. Ён інтэгруе беларускую міталёгію ва ўсе сусьветныя міталягічныя каноны. «Крывавы памол» — вельмі галівудзкі твор».

**Юлія Амельяновіч, настаўніца беларускай літаратуры, Наваградчына**: «Думаю, што «Сны імпэратара» Ўладзімера Арлова».

**Ігар Сарокін, доктар-псыхіятар:** «Дзьве рэчы з Быкава — «Жоўты пясочак» і «Яго батальён». У адным творы расказваецца пра тое, як ваявалі супраць народу, у другім — як ваяваў сам народ. Экранізацыя гэтых твораў дазволіла б нам больш зразумець пра даваенны і ваенны час у Беларусі».

**Пятро Васючэнка, літаратуразнаўца:** «Па аналёгіі з Польшчай мы мусім экранізаваць нашы нацыянальныя эпасы — «Новую зямлю» Коласа і «Палескую хроніку» Мележа. Цэлы сэрыял можна паставіць на аснове беларускіх сярэднявечных летапісаў («Летапіс вялікіх князёў літоўскіх», «Ле-

**Што экранізавана зь беларускае клясыкі?**

Найбольшая колькасьць экранізацый прыпадае на Васіля Быкава: «**Трэцяя ракета», «Альпійская баляда», «Пастка», «Воўчая зграя», «Дажыць да сьвітаньня», «Абэліск», «Пайсьці і не вярнуцца»** (двойчы), **«На Чорных лядах»**. **«Жураўліны крык»** увайшоў у «Доўгія вёрсты вайны». А «Узыходжаньне» — паводле **«Сотнікава»** — стала адным з найлепшых беларускіх фільмаў.

Шмат экранізавалі і Алеся Адамовіча: **«Вайна пад стрэхамі», «Сыны ідуць у бой». «Франц і Паліна». «Карнікі»** і **«Хатынская аповесьць»** сталіся стужкаю «Ідзі і глядзі».

Караткевіч увасобіўся на экране **«Дзікім паляваньнем караля Стаха»**, «Жыцьцём і ўзьнясеньнем Юрася Братчыка» (**«Хрыстос прызямліўся ў Гародні»**) — і **«Маці ўрагану».**

Экранізаваныя творы Якуба Коласа **«На прасторах жыцьця»** — як «Песьня вясны» (1929), **«На ростанях»** — як «Першыя выпрабаваньні» (1960). А Уладзімер Колас, сёньня дырэктар Беларускага ліцэю, дэбютаваў з «Маладым дубком» (1980). **«Сымон-музыка»** на тэлеэкране стаўся «Песьняй музыкі».

Янка Купала прадстаўлены **«Паўлінкай»** (1952 і 1972) і **«Раскіданым гняздом»** (1981); маецца й тэлеспэктакль **«Тутэйшыя»** (1992).

Пастаўленыя **«Людзі на балоце»** Івана Мележа, **«Рудабельская рэспубліка», «Хто сьмяецца апошнім», «Несьцерка»** (у тым ліку й анімацыя), **«Судны дзень»** Віктара Казько (як «Сьведка»), **«Чужая бацькаўшчына»** Вячаслава Адамчыка, **«Міколка-паравоз»** і **«Палескія рабінзоны»** (двойчы).

А першая беларуская экранізацыя — «Лясная быль» 1926 г. паводле **«Сьвінапасу»** Міхася Чарота.

**Андрэй Расінскі**

# літаратуры варта экранізаваць?


**«Чужая Бацькаўшчына» паводле Вячаслава Адамчыка: стылёвая і на дзіва несавецкая стужка «Беларусьфільму».**

тапіс Вялікага княства Літоўскага, Рускага і Жамойцкага» і «Хронікі Быхаўца»). Мыльная опэра ў пяцьсот сэрыяў магла б атрымацца з навэлі Францішка Багушэвіча «Траляленачка».

**Міхась Тычына, літаратуразнаўца:** «Аповесьць Васіля Быкава «Бліндаж». Гэта гатовы сцэнар. Твор мае вельмі круты сюжэт. Тым больш, у «Бліндажы» ёсьць эпізоды, зьвязаныя з кіно, згадваецца імя Анджэя Вайды. Таксама варта было б экранізаваць раман Алеся Наварыча «Літоўскі воўк». Гэта спэцыфічны, погляд на вядомыя падзеі беларускай гісторыі. «Літоўскі воўк» — нетрадыцыйны твор для нашай літаратуры, з элемэнтамі дэтэктыву, са зьменай кадраў, містыкай і міталёгіяй. З гэтага мог бы атрымацца добры трылер».

**Генадзь Бураўкін, паэт:** «Ня ўсе экранізацыі задавальняюць. Напрыклад, «Тутэйшыя» Янкі Купалы. Мне хацелася бачыць фільм на гэты твор ня горшы, чым спэктакль у Купалаўскім. Таксама мне шкада, што неяк міма кіно прайшлі такія пісьменьнікі, як Кузьма Чорны і Максім Гарэцкі. «Дзьве душы» маглі б ідэальна глядзецца на экране».

**Лявон Юрэвіч, бібліятэкар:** «Былі спробы экранізацыі добрых твораў — і Караткевічавых, і «Шляхціца Завальні». Выбіралі нездарма, думалі, сам тэкст уратуе, сюжэт, але ж... Дык зрабіць новыя вэрсіі — самы раз. «Хрыстос» — у добрых руках і з разумнаю галавой спрадзіў бы хвалю насьледаваньняў у Галівудзе. Караткевічавы «Леаніды» маглі б стаць проста беларускай Love Story новага часу. Зь неэкранізаванага прапаную «Невядомую вайну» Сагановіча».

**Барыс Тумар, публіцыст:** «Гарэцкі. Час здымаць паводле Гарэцкага. Кароткі мэтраж паводле апавяданьняў. «У лазьні» — сапраўдны шэдэўр. І, канечне, «Дзьве душы» і «Віленскія камунары». Гэта матэрыял для оскараўскіх сцэнароў. Грандыёзны гістарычны кантэкст — нараджэньне беларускай нацыі, эўрапейская рэвалюцыя — і натуралізм пачуцьцяў. Гарэцкі лёгкі для экранізацыі, бо быў як майстрам і эпічнага паказу эпохі, і эпізоду. Мне жыва ўяўляюцца на экране сцэны, як на лаўцы Александраўскага саду спакушае героя «Віленскіх камунараў», рэвалюцыянэра, менская мяшчаначка, падсоўваючыся да яго мяккім гарачым бокам, або, зусім іншая танальнасьць, як віленчукі лавілі і елі варанятаў у часе нямецкай акупацыі. У той жа час сюжэты Гарэцкага не закрытыя, яны лёгка надаюцца на пашырэньне і разьвіцьцё. Фільмы паводле Гарэцкага сталі б сэнсацыяй. Толькі калі мы дажывем, калі выгадуюцца сцэнарысты і рэжысэры, здольныя ўстаць на адну дошку з Гарэцкім па разуменьні чалавека й гісторыі? Пакуль такіх нешта ня бачыцца...»

**Апытаў Зьміцер Панкавец**

### Што здымаюць беларускія рэжысэры?

**«Беларусьфільм»** загружаны прапагандысцкімі «вайскова-патрыятычнымі» праектамі. Да прыкладу, **«Радзіма альбо сьмерць»** Алы Крыніцынай. Чэ Гевара тут не пры чым: гэты супольны расейска-беларускі фільм апавядае пра дзетак-дывэрсантаў, якіх рыхтуюць нацысты. А добрыя агенты НКВД нацыстам перашкаджаюць. Фільм здымаўся як «патрыятычны» адказ на расейскі фільм «Сволачы» пра спэцшколу НКВД, дзе ўсё было наадварот.

На замову Міністэрства абароны Беларусі «Беларусьфільм» здымае шпіёнскі фільм **«Шчыт Айчыны»**. Сюжэт нібы прывандраваў з савецкага кінэматографу 30-х: працай маладога лейтэнанта Аляксея зацікавіўся шпіён Дзік Оўэн, які выдае сябе за бізнэсоўца. Рэжысэр карціны — выхаванец Міхаіла Пташука **Дзяніс Скварцоў.**

Яшчэ адзін выхаванец Пташука **Андрэй Голубеў** здымае вайсковую драму **«Чаклун і Румба».** Чаклун — гэта сапёр, Румба — яго сабачка. Варыянты разьвіцьця сюжэту?..

Рэжысэр **Іван Паўлаў**, аўтар касавай каляніяльнай камэдыі «Сьвежына з салютам», робіць новую: **«На сьпіне ў чорнага ката»**. Фільм «з элемэнтамі містыкі» распачынаецца так: дзед Лёха набывае ў няшчаснай жанчыны лятарэйны білет.

А разам з аніматаркай **Аленай Туравай**, дачкой Віктара Турава, І.Паўлаў ставіць на «Беларусьфільме» фільм-казку «Навагоднія прыгоды ў ліпені».

**Андрэй Кудзіненка**, аўтар забароненага ў Беларусі фільму «Акупацыя. Містэрыі», зарабляе ў Расеі. Нядаўна ён здымаў сэрыял «Кадэткі» (вельмі папулярны цяпер ва Украіне) і цяпер разам са сцэнарыстам «Акупацыі» Аляксандрам Качаном робіць рэмэйк савецкай стужкі 1976 г. «Розыгрыш».

А рэжысэр **Аляксандар Кананові́ч** здымае поўнамэтражную стужку на студыі рэжысэра Аляксея Ўчыцеля, які прадусаваў і фільм беларускі Марыі Мажар «Ворагі».

**АР**

# Дзядзька Антось зноў у Вільні

Дзядзьку ў Вільні сустрэлі студэнты ЭГУ і правялі яго маршрутам Коласавай «Новай зямлі». Піша **Натальля Мяшкова**.

13 чэрвеня ў сьценах Эўрапейскага гуманітарнага ўнівэрсытэту ў Вільні адкрылася фотавыстава «Як дзядзька Антось у Вільню езьдзіў». У пэўнай ступені яна сталася вынікам вольнага абыходжаньня студэнтаў ЭГУ з часам і прасторай (у прыватнасьці, віленскіх вулак), і адначасова — вельмі паважлівага стаўленьня да спадчыны Якуба Коласа. А апярэджвала гэтую падзею аднайменная тэатралізаваная экскурсія па Вільні, прысьвечаная 125-годзьдзю з дня нараджэньня клясыка. Вандроўку задумалі і правялі студэнты 2-га курсу спэцыялізацыі «Гісторыя Беларусі і культурная антрапалёгія», а сваё асэнсаваньне нядаўняй рэтра-экскурсіі і ўвогуле месца і ролі нацыянальнай традыцыйнай культуры ў сучасным кантэксьце прадставілі іх калегі з праграмы «Візуальны дызайн і мэдыя».

Ключавая частка паэмы «Новая зямля» прысьвечаная паездцы аднаго з галоўных герояў — дзядзькі Антося — у Вільню. У свой час дасьледчыкі Алесь Белы зь Менску і Андрэй Антонаў зь Вільні «аднавілі» маршрут коласаўскага героя. Гэтая рэканструкцыя натхніла студэнтаў-беларусістаў на правядзеньне экскурсіі.

Апоўдні ў нядзелю 3 чэрвеня дзядзьку Антося на віленскім чыгуначным вакзале сустракалі студэнты і выкладчыкі ЭГУ, віленскія беларусы. У натоўпе былі заўважаны прыгажуні і хлопцы ў нацыянальных беларускіх строях (у пошуках якіх беларусісты дабраліся нават да Літоўскай кінастудыі). Разам зь літаратурным пэрсанажам калярытная кампанія некалькі гадзін блукала па віленскіх вулках.


Студэнты-беларусісты ЭГУ ў абліччы Коласавых герояў.



«Дзядзька» на віленскім вакзале.

Ад вуліцы Пілімa (Завальнай), празь Лідзкую і Кейданскую, празь Нямецкую і Віленскую, і шмат яшчэ якія «gatvės» пралягаў маршрут экскурсіі. Урэшце дзядзька Антось адшукаў правільную дарогу, трапіў у банк (цяпер гэта Віленскі паштамт), а потым... Несумненна, гэта была самая прыемная частка вандроўкі. Памятаеце, пасьля таго як Антось уладзіў свае справы, ён разам з новым сваім сябрам вырашыў адпачыць і за адным махам падсілкавацца на гары Гедыміна. Арганізатары экскурсіі зь вялікім задавальненьнем рэканструявалі і гэтую частку паэмы. Вандроўка завяршылася пікнікам ля вежы Гедыміна з найсмачнейшымі квасам, хлебам, салам і гуркамі. Для максымальнай паўнаты карціны трэба дадаць яшчэ шыкоўныя даляглядзы віленскіх ваколіц, якія адкрываюцца з вышыні.

У клясычных твораў лёс незайздросны — з аднаго боку іх вартасьць прызнаецца бясспрэчнай, а з іншага — існуюць яны ў рэальнасьці застылай і «заштампаванай», пазбаўленай сьвежага паветра. Сваёй экскурсіяй віленскія студэнты-беларусісты імкнуліся разбурыць стэрэатыпы і тым самым вярнуць «Новую зямлю» ў жывую рэчаіснасьць. Задума ўдалася.

## Беларускі Ракфэлер

Найбольшы прыбытак за 2006 г., задэкляраваны фізычнай асобай у Беларусі, перавысіў 20 млрд. рублёў, паведмляе Міністэрства па падатках і зборах.

Сфэра дзейнасьці гэтай асобы не ўдакладняецца. Не камэнтуецца і меркаванне аднаго з банкіраў аб наяўнасці ў Беларусі 7—10 тысяч даляравых мільянэраў.

## Бясплатныя візы ў Літву застануцца

Пасьля далучэньня да Шэнгенскага пагадненьня, якое заплянавана на 1 студзеня 2008 г., Літва па-ранейшаму пакіне бясплатнымі візы для асобных катэгорый грамадзянаў Беларусі, у тым ліку для асоб малодшых за 21 год і старэйшых за 65 гадоў, для дзеячоў навукі, культуры і мастацтва, для тых, у каго на тэрыторыі Літвы пахаваныя блізкія сваякі.

Літоўскі пасол Эдмінас Багдонас перакананы, што плянаванае падвышэньне кошту шэнгенскіх віз да 60 эўра нэгатыўна паўплывае на двухбаковыя адносіны Беларусі і Літвы. Ён падкрэсьліў, што ў Брусэлі Літва пастаянна на ўсіх узроўнях выступае за зьніжэньне кошту віз для беларускіх грамадзян.

## Загінуў самы знакаміты альпініст Беларусі

Адзін зь нямногіх у краіне майстроў спорту міжнароднае клясы, які ўзышоў на некалькі васьмітысячнікаў, загінуў у Маскве

Ураджэнец Сьветлагорску Віктар Кульбачэнка меў тытул Сьнежны Барс. Горнымі ўзыходжаньнямі Віктар захапіўся яшчэ ў 1981 г. Па прафэсіі лекар — скончыў Менскі мэдінстытут.

У апошнія гады ён пераключыўся на прамысловы альпінізм. Галоўнае яго спартовае дасягненьне — вяршыня Канчанджанга (8586 м), у кастрычніку 1994 г., у рамках Першай нацыянальнай беларускай экспэдыцыі ў Гімалаі. Да Масквы В.Кульбачэнка працаваў у Барысаве доктарам-гігіеністам. У красавіку яму споўнілася 45 гадоў.

## Новыя правілы ўвозу грошай у ЭЗ

Цяпер усе тыя, хто ўяжджае на тэрыторыю ЭЗ альбо пакідае яе і правозіць суму, што перавышае 10 тысячаў эўра, павінныя дэкляраваць яе. Ня мае значэньня, ці сума правозіцца ў эўра, у іншай валюце альбо, напрыклад, у выглядзе чэкаў. Мытныя службы ЭЗ маюць права аглядаць багаж і затрымліваць не задэклараваныя сродкі. Асноўная мэта новых правілаў — папярэджаньне фінансаваньня незаконных дзеяньняў, у прыватнасьці, тэрарызму і злачыннай дзейнасьці.

## Самы доўгі тунэль

Самы доўгі ў сьвеце мацерыковы тунэль адчынены ў Швайцарыі. Ён цягнецца 35 км і злучае Фрутыген у кантоне Бэрн з Рарон у кантоне Валаіс. Тунэль, пабудаваны за восем гадоў і 4,3 млрд. швайцарскіх франкаў, скароціць час язды цягнікоў зь Італіі ў Нямеччыну з трох гадзінаў да няпоўных дзьвюх. Таксама ён дазволіць лыжнікам хутчэй даяжджаць да швайцарскіх курортаў. У сьвеце існуюць цяпер толькі два даўжэйшыя за яго падводныя тунэлі — у Японіі і тунэль пад каналам Ля-Манш.

**БелТА; «Электронный Борисов»; БелаПАН; Вольга Данішэвіч, паводле gazeta.pl**

# Эўразьвяз у барацьбе з алькагалізмам

У СССР да Другой Сусьветнай вайны спажывалі ў год 3,7 літраў чыстага сьпірту на душу насельніцтва. Пасьля, у брэжнеўскі застой, савецкія людзі сталі піць больш за небясьпечныя 8 літраў сьпірту на душу, ад чаго пачынаецца дэградацыя нацыі.

Цяпер, паводле розных падлікаў, беларусы выпіваюць на сям'ю з чатырох чалавек 272 бутэлькі ў год. На думку галоўнага нарколяга краіны Уладзімера Максімчука, у Беларусі да мільёну грамадзянаў залежаць ад алькаголю. У стане алькагольнага ап'яненьня зьдзяйсьняецца тры чвэрці забойстваў, больш за 60% боек, што скончваюцца шпіталем, 70% згвалтаваньняў, каля 70% разбояў і хуліганства.

## А як у Эўропе?

Паводле дадзеных мэдыкаў Эўрапейскага Зьвязу, «Эўропа характарызуецца самымі высокімі ўзроўнямі (ад 4,9 да 12,6 л на душу насельніцтва) спажываньня алькаголю. Наступствы гэтага аналягічныя нашым — высокая сьмяротнасьць на дарогах, гвалт, злачынствы. Алькаголь адказны за раньнюю сьмяротнасьць і непрацаздольнасьць 12% мужчынаў і 2% жанчынаў у ЭЗ». Праўда, адзначана, што традыцыйнае спажываньне віна ў эўрапейскіх краінах заўважна ідзе на спад, у сярэднім на 75 мільёнаў літраў у год.

## Формы і мэтады барацьбы

У ЭЗ новая тэндэнцыя — палітыкі намагаюцца на афіцыйных мерапрыемствах ня брацьу рукі нават шампанскае. Каб не фарміраваць у сьвядомасьці людзей асацыяцыю алькаголю і посьпеху. Згодна з эўрапейскім плянам барацьбы з алькагалізмам, плянавалася скарачэньне спажываньня алькаголю на жыхара кожнай эўрапейскай краіны на 25% за пяць гадоў. У пэрыяд ад 1995 да 2000 г. Францыя і Італія, здолелі гэтага дасягнуць. Эўрапейская Камісія прапанавала, напрыклад, скараціць вінаробныя плошчы на 400 тыс гектараў. Замест гэтага ўладальнікам плянтацыяў прызначаліся фінансавыя сродкі для перапрафіляваньня сваёй вытворчасьці альбо датэрміновага выхаду на пэнсію. У мінулым годзе Эўракамісія прыняла Камунікацыю, у якой вызначаная стратэгія падтрымкі дзяржаваў–членаў у зьмяншэньні шкоды, зьвязанай з алькаголем. Напрыклад, ператварыць больш за 730 млн бутылек францускага і італьянскага віна ў паліва, мыючыя сродкі і дэзынфэктанты. На гэтую мэту асыгнавана звыш 130 млн эўра, а летась было выдаткавана паўмільярду эўра.

У чэрвені стартуе Форум па пытаньнях алькаголю і здароўя (Alcohol and Health Forum), які дапаможа вызначыць рэгуляваньне рынку сьпіртовых напояў. Эўракамісія заклікала краіны ЭЗ абмежаваць рэкляму алькаголю, асабліва на тэлевізіі, павялічыць падаткі на алькаголь, патрабаваць нанясеньня на этыкеткі бутэлек з моцнымі напоямі надпісаў пра іх шкоду для здароўя чалавека. Але ўрады не сьпяшаюцца з увядзеньнем абмежаваньняў.

У Беларусі ж змагаюцца з алькагалізмам спэцыфічна: сёлета квоты на выпуск этылявага сьпірту павялічаныя на 190 тысячаў дэкалітраў. Пры гэтым існуе дзяржпраграма дзеяньняў па папярэджаньні і пераадоленьні п'янства і алькагалізму на 2006–2010 г. Праграма заснаваная, перадусім, на адукацыйных пачатках, на думку распрацоўшчыкаў, эфэкту ад яе можна чакаць праз 15—20 гадоў. Але важны крок да скарачэньня алькагалізацыі зроблены — нядаўна ў краіне ўхвалілі закон, якім забараняецца рэклама піва — тэлевізійная і знадворная.

**Самая пітушчая краіна ЭЗ — Люксэмбург, самая малапітушчая — Швэцыя. Італія зь яе традыцыйным абедам зь віном выглядае цьвярозьніцай: там прыходзіцца менш за 7 л этылу на душу насельніцтва, у 2 разы менш, чым у Беларусі!**

Дадзеная публікацыя падрыхтаваная пры судзеяньні Эўразьвязу і не абавязкова адлюстроўвае афіцыйны пункт гледжаньня ЭЗ.
Па дадатковую інфармацыю зьвяртайцеся на сайт www.delblr.ec.europa.eu

СЬЦЯПАН ДЗІН-ДЗІЛЕВІЧ

# На Купальле



МАЛЯВАЎ СЯРГЕЙ ХАРЭЎСКІ

Як вядома, на Купальле здараюцца цуды. Скарбы вылазяць зь зямлі, зьвяры і птушкі гавораць чалавечымі галасамі, дрэвы і камяні пераходзяць зь месца на месца… І вось аднойчы ў Менску на Купальле здарылася наступнае. Позна ўначы, калі ўвесь горад ужо спаў, каля помніку Янку Купалу зацьвіла папарaць-кветка. Ад яе абудзіўся вялікі паэт. І, як потым аказалася, іншыя помнікі. Купала расправіў плечы, абтрос пыл вякоў, узяў кіёк дарожны і сказаў: «А хто там ідзе?» І сам пайшоў. Спачатку ён пайшоў да рэчкі Сьвіслач (яна цячэ непадалёку). Там купаліся дзяўчаты. «Дзеўкі, канчай гэтыя распусныя гульні. Настаў час змаганьня. Сёньня нам трэба разьбіць ворагаў і ачысьціць родную зямлю ад чужынцаў. Апранайцеся зараз жа і бяжыце зьбірайце ўсіх нашых», — сказаў дзядзька Янка і нават паліто сваё зьняў, каб тым было што апрануць. «Што вы, спадар Янка! Не, мы пойдзем так — як сапраўдныя амазонкі. Нашых будзем натхняць, а ворагаў заманьваць у засаду». Кінуліся яны бегчы. Адна пабегла да Максіма Багдановіча. Багдановіч убачыў дзяўчыну і давай страчыць: «Зорка Вэнэра…» «Адставіць, спадар паэт! Цяпер ня час на любошчы. Час выпраўляцца ў пагоню». «За цябе мне ўмерці дазволь», — сказаў рашуча паэт іншым вершам. Другая дзяўчына пабегла да Якуба Коласа. Колас, пачуўшы навіну, трохі пасядзеў, падумаў і выдаў: «Я маўчу, маўчу, трываю, але хутка загукаю — стрэльбы, хлопчыкі, бяры…» Трэцяй дзяўчыне выпала самая далёкая дарога — да Францішка Скарыны. «Дзядзечка Францішак, няма часу слухаць мудрае чытаньне з вашай кнігі, надта далёка бегчы». «Гэта ж гэныя гады наўмысна мяне так далёка запёрлі.

Я ж мусіў стаяць каля Акадэміі навук. Але нічога, пасьпеем — як пчолы, што бароняць вульлі свае…»

Нарэшце ўсе сабраліся каля цырку. Сталі думаць: а куды ісьці? Апазыцыя заўжды спрабуе адсюль на цэнтральную плошчу прайсьці. Мусіць, там ворагі і заселі. Хадзем туды.

Гэта было прыгожа. Зямля скаланалася ад іхнага магутнага поступу. Неба разьлягалася ад гукаў пераможнага гімну «А хто там ідзе ў агромністай такой грамадзе? Беларусы». Нішто іх не магло стрымаць і яны выйшлі на плошчу. А там нікога няма… А чаго яны тады сюды сьцяміліся? Тут зь лесу выйшаў хлопчык зь лебедзем. Вуснамі дзіцяці глаголіць ісьціна, і хлопчык ім сказаў: «Трэба ісьці далей, да Незалежнасьці. Там стаў вораг». І нашыя героі пайшлі далей. Знайшоўся адзін здраднік, са сваіх, тутэйшых — Фэлікс Дзяржынскі. Хацеў ён затрымаць нашых змагароў, але дзе ж ты супраць такой сілы пойдзеш. Нашыя разьбілі ворага, літаральна разьбілі, на кавалачкі раскрышылі. Потым галаву знайшлі, паставілі на тым месцы. Толькі розныя экскурсаводы па-рознаму тлумачаць гэта. Адныя хваляцца — маўляў, вось як нашыя героі гэнага гада… А другія бядуюць — вунь як гэныя гады нашага героя… Ну, але трэба ісьці далей. Калі ўжо біцца дык біцца — падавай галоўнага ворага. Ён захапіў нашу плошчу Незалежнасьці, ён захапіў наш Дом ураду. Ну нічога, мы яго зараз разаб’ем. На кавалачкі. На друз. У пыл.

Выйшлі на плошчу. Па дарозе сустрэлі яшчэ сьвятога Юр’ю, спыталіся блаславеньня. «Сьвятую справу задумалі. Я з вамі пайду. Дзіда мая праткне яшчэ аднаго злыдня»,— сьвяты Юр’я пераступіў забітага цмока і паляцеў наперадзе беларускага войску. І вось падышлі яны да галоўнага ворага. Гэта быў Уладзімер Ільліч Гультаеў. Пасталі, паглядзелі, зьдзівіліся: казалі, вялікі правадыр, вялікі правадыр — а ён жа ў параўнаньні з намі зусім малы. Ды мы яго зараз.

Але не пасьпелі. Запяяў певень. Высьветлілася, што той цмок, якога яны пакінулі каля чырвонага касьцёлу, ня здох, а толькі так, прыкідваўся. І ня тое, што ён шкадаваў бязбожніка Гультаёва, — наадварот, ён сам меў на яго зуб за тое, што бязбожнікі нішчылі веру ня толькі ў Бога, але і ў Чорта. Дык вось, гэты цмок ня праз Гультаёва, а праз сваю паганую такую натуру, каб усё папсаваць, узяў і запяяў пеўнем. А вядома, як певень запяе — канец усім купальскім чарам. У адно імгненьне помнікі вярнуліся на месцы. Але нічога, не апошні раз Купальле сьвяткуем…

*Вільня — Менск*



МАЛЯВАЎ СЯРГЕЙ ХАРЭЎСКІ

# Новы pARTisan

Тэма нумару — вайна.

**pARTisan** № 5, 2007, альманах сучаснае беларускае культуры, Менск: Логвінаў, накл.250 ас.




шукайце ў кнігарнях і ў незалежных распаўсюднікаў

ЮРЫ ЮРКАВЕЦ

# Сусьветны вулей,
## альбо Ўводзіны ў кансьпіралёгію



Некаторыя наіўныя людзі да гэтага часу лічаць, што сьве там кіруюць масоны. Але як жа яны памыляюцца! Насамрэч стырно ўлады ўжо даўно перайшло ад вольных муляроў ва ўчэпістыя рукі свабодных пчаляроў. Так-так, менавіта пчаляры, гэтыя на першы погляд лагодныя й бяскрыўдныя аматары дробных і кусьлівых казурак, зьяўляюцца сёньня сапраўднымі вяршыцелямі лёсу сьвету.

Азірніцеся: вы ня знойдзеце ніводнага больш-менш сур'ёзнага бізнэсмэна альбо палітыка, на сядзібе якога не гудзеў бы дзясятак-другі вульлёў. І чым больш важная, чым больш уплывовая пэрсона, тым большага памеру будзе яе пчальнік. Паспрабуйце толькі паткнуцца ў хаўрус да «крутых», і вас адразу ж пачнуць «прабіваць»: колькі ў цябе вульлёў? Чым падкормліваеш? Якога колеру выходзіць мёд з валошак? І ніхто ня будзе мець ніякіх справаў з чалавекам, які ў жыцьці не злавіў ніводнага рою.

У пчаляроў існуе сыстэма таемных знакаў, сутнасьць якіх вядомая толькі пасьвячоным, і па якіх яны беспамылкова распазнаюць сваіх. Напрыклад, пчала — адзін з такіх знакаў. Начапіце запанкі ў выглядзе залатой пчалы з дыямэнтавымі вачыма й пасярэбраным джалам і прыйдзіце да любога банкіра — і ў тую ж гадзіну атрымаеце патрэбны вам крэдыт пад цалкам сьмяхотныя адсоткі. Варта вам у любым канцы сьвету, у любой краіне, на дыпляматычным прыёме альбо на сьвецкай вечарыне, дзе вы не знаёмыя ні з адным чалавекам, нягучна прамовіць: пчолы! — як у вас утаропяцца дзясяткі вачэй, да вас з усіх бакоў пацягнуцца кілішкі й далоні, і ў вас знойдуць суразмоўцу найбагацейшыя й найуплывовейшыя людзі.

На свае патаемныя сходы, дзе плятуцца ніткі сусьветнае змовы, пчаляры заўжды сыходзяцца ў белых баваўняных балахонах і адмысловых масках — шыракаполых капелюшах з накідкай з чорнага цюлю. Як закаранелыя ліхадзеі, хаваюць яны свае твары. На стале яны заўсёды трымаюць напагатове раскураны дымар, каб умомант асьляпіць нязванага госьця, калі такі раптам зьявіцца.

Усе пчаляры зямлі аб'яднаныя ў адзіную арганізацыю зь цьвёрдай герархіяй. Штаб-кватэра арганізацыі, так званая сымбалічная Пчала-Матка, затоеная ў горных лугох містычных Гімалаяў. У кожнай краіне месьціцца свой, нацыянальны «рой», які бесьпярэчна выконвае ўсе ўказаньні Пчалы-Маткі. Вулей — вось тая ідэальная мадэль сьветаўладкаваньня, да якой імкнуцца пчаляры, і тая патаемная мэта, якую яны дбайна хаваюць ад непасьвячоных. Вулей, дзе кожны дакладна ведае сваё месца, і дзе ўсякі ўносіць сваю лепту на карысьць агульнае справы і ўсё падпарадкаванае адзінаму цэнтру. З зацятасьцю й працавітасьцю пчалы штодня зьмяняюць пчаляры сьвет, надаючы яму геамэтрыю пчаліных сотаў. Сьвет у іх руках — падатлівы гарачы воск, і нішто на зямлі не адбываецца бязь іх санкцыяў — войны, зьмены ўрадаў, рэвалюцыі, перасыханьні крыніц, мор быдла або дэфіцыт бюджэту — за кожнай падзеяй пільны погляд разгледзіць доўгія рукі ў белых пчалярскіх пальчатках. І яны будуць нястомна працягваць сваю таемную дзейнасьць, покуль не падпарадкуюць сабе ўсе народы й уся плянэта канчаткова не ператворыцца ў гіганцкія соты.

Шмат хто з амбітных маладзёнаў марыць зрабіцца пчаляром, трапіць у кола абраных, але гэта практычна немагчыма. Таемныя веды пчалярства перадаюцца ад бацькі да сына, з пакаленьня ў пакаленьне ў вуснай форме. Прафана ніколі не дапусьцяць да пчол. Выпадковы чалавек таксама, канечне, можа завесьці пчолы, але нічога добрага, як паказвае практыка, з гэтага ня выйдзе: ці то пчолы пакусаюць, ці то мёд ня будзе мець смаку й гаючае моцы, ці то мядзьведзі, пра якіх ніколі раней ня чулі ў гэтых мясьцінах, будуць рэгулярна спусташаць зьмесьціва яго вульляў. І ўжо наўрад ці хто ўспрыме самазванца сур'ёзна.

І калі вы будзеце бачыць чарговага выратавальніка нацыі й слухаць яго салодкія, мядовыя абяцанкі — прыгледзьцеся, ці не тырчыць дзе-небудзь з-пад строгага дзелавога гарнітуру край белага баваўнянага халату пчаляра і ці не хавае ён за сьпінаю маску з чорнага цюлю й дымар, каб нечакана пусьціць вам у вочы едкі дым…

# Знакі прыпынку



**УЛАДЗІМЕР НЯКЛЯЕЎ**

***

Вясной 1942 года крэўскі бацюшка і адначасна настаўнік беларускай мовы Міхась Леванчук падаўся ў Менск, каб выпрасіць у Генэральным Камісарыяце дазвол на адкрыцьцё ў Крэве беларускай школкі. Сьвятара-настаўніка прыняў сам Генэральны Камісар Вільгельм Кубэ і школку адкрыць дазволіў.

Летам 1942 г. у газэце «Minsker Zeitung» быў надрукаваны верш «Weissruthenien» («Беларусі») з гэткай апошняй страфой:

> Мы з Рэйху, зьвязаныя ніткай адной
> Зь сівой даўнінай, што ня стлела,
> Саткаць дапаможам вам белы сувой,
> Каб гэта краіна пад зоркай сваёй
> І хлеб свой, і радасьць займела.

Нехта мог падумаць, што гэта ўсяго толькі зьвершаваная прапаганда, а хтосьці мог сказаць, што і не…

Пад вершам стаяла імя нейкага Карла Курца, але ўсе здагадваліся, што напісаў яго Вільгельм Кубэ, які лічыў беларусаў арыйскім народам. Таму цікавіўся старажытнай беларускай культурай, нават п’есу стварыў пра гістарычныя дачыненьні германцаў зь беларусамі. Спэктакль зьбіраліся паставіць да дня народзін Генэральнага Камісара, ды не пасьпелі: у ноч на 22 верасьня 1943 г. Кубэ зьнішчылі. Зрабілі гэта савецкія спэцслужбы (пры ўдзеле асавечаных тутэйшых) з дазволу, які выявіўся ў нясупрацьдзеяньні, спэцслужбаў нямецкіх. Пасьля забойства і СС, і СД без асаблівага спрыту займаліся перасьледам падазроных.

У ноч на 15 сакавіка 1944 г. быў зьнішчаны крэўскі сьвятар і настаўнік Міхась Леванчук. Зрабілі гэта жаўнеры Арміі Краёвай (пры ўдзеле апалячаных тутэйшых) з дазволу, які выявіўся ў несупрацьдзеяньні, гарнізону літоўскай паліцыі. Гарнізон стаяў у Крэве для аховы *ордынгу* і здаўся краёўцам бяз бою.

Зусім розныя людзі: дзе той гаўляйтэр — і дзе той настаўнік… А лёс адзін.

Небясьпечная рэч — схільнасьць да беларускага.

P.S. Калі ў 1996 г. хавалі Героя Савецкага Саюзу А.Р.Мазанік, якая была непасрэднай выканаўцай забойства гаўляйтэра, труна зь ейным целам стаяла ў Доме афіцэраў на тым самым месцы, на якім у 1943 г. стаяла труна зь целам Генэральнага Камісара Беларусі Вільгельма Кубэ.

***

З гадамі ўсё больш адчуваецца адсутнасьць сэнсу быцьця. Ня толькі быцьця ўвогуле, на якое, калі б не было цябе, напляваць, але, на што, здавалася б, не плюнуць, і быцьця ўласнага, свайго існаваньня. Усё часьцей узьнікае пытаньне: «Ну і што?..» Яно і не пытаньне нават, нейкая няўцямнасьць: «Ну… і… што…» Ну, жыў ты, жывеш — ну і што? Дамагаўся нечага і дамогся — ну і што? Грошы нейкія, славу нейкую займеў — ну і што? Прыдумаў нешта, напісаў — ну і што? Памрэш — ну і што?

Усё — нічога.

Але нічога і ёсьць усё.

***

Што там ні кажы пра чалавецтва, а ўсё ж у большасьці людзей кутніца знаходзіцца ніжэй за галаву.

***

Знайшоў даўні запіс — ня помню ўжо, скуль яго ўзяў:

«Пачалі варушыць архівы КДБ і знайшлі (сярод іншага) вось што... У канцы 30-х гадоў у адной вёсцы сярод ночы зьнік мужык. Стары, глуханямы. Ён быў арыштаваны і расстраляны праз во гэтакі данос (цытую):

«…сядзеў на ганку і па-антысавецку ўсьміхаўся».

***

Жыцьцё ў разумных межах ён скончыў самазабойствам.

***

Бліскучы расейскі актор Міхаіл Жараў пад старасьць сыграў абы-што ў абы-якім фільме «Вясковы дэтэктыў». А некалі грандыёзна граў Меншыкава… І, баючыся гэтай ролі, казаў А.Талстому: «Не цягну я на любімца Пятра, нешта ўва мне ёсьць камсамольскае». Талстой адказваў: «Можа, і ёсьць, але пакуль не выяўляецца».

З часам выявілася. І не ў аднаго Жарава…

***

Калі з маладосьці было відно, які крэтынізм — старасьць, дык са старасьці відно, якое наіўнае глупства — маладосьць.

Вось і ўвесь жыцьцёвы досьвед.

***

Усьміхайся! Гэта раздражняе.

***

Найцяжэй прывыкнуць да чалавечай разнастайнасьці. Адсюль: інакшых не павінна быць!

***

«Любі Бога і рабі, што хочаш», — сказаў Сьвяты Аўгустын.

«Хочаш — рабі проста вайну, а хочаш — сусьветную. Адно не забывайся любіць Бога. А калі гэтая любоў аж прэ горлам, дык ты з воклічам «Алаг акбар!» можаш нават скіраваць аэробусы зь людзьмі ў хмарачосы Нью-Ёрка», — разьвівае гэтую тэзу Валянцін Акудовіч.

Во як можна зразумець Сьвятога.

***

У Міхася Стральцова ў апавяданьні «Сьвет Іванавіч, былы донжуан» сказ: «І ўюнашы абступаюць мяне і пытаюць, якія я куру цыгарэты...»

Калі ня ведаць таго, што можна назваць *асабістай* гісторыяй беларускай літаратуры, дык не дапяць: скуль у такога стыліста, як Стральцоў, гэткая дзікунская калька, як *уюнашы*? А слоўца гэтае акурат з *асабістай* гісторыі літаратуры, яно — памяць пра Міхася Лынькова, які да ўсіх маладзейшых толькі так і зьвяртаўся: «Ну што, *уюнашы*...»

МАРЫЯ ВАЙЦЯШОНАК

апавяданьне

# Навасельле ў Ждановічах

Дом стаяў у цесным гурце другіх і, выдавалася, зайшоў сюды выпадкова, на некаторы час. І тут, у натоўпе, ён усё-ткі знайшоў сабе, як прыступку пад ногі, каб неяк адасобіцца, маленькае лабатае ўзвышша і спыніўся. Дом зь ясным далёкім зрокам, вокны ва ўсе бакі, ён бы аглядаўся, каб бачыць блакітныя пагоркі зь вінаграднікам, усход і захад, пільнаваць пагоду, шчыльны, без прыўкрас, каб выстаяць пад вятрамі. Ён мог бы, верагодней за ўсё, знаходзіцца дзе-небудзь у Таскане, так, у Таскане, і мець сабе некалькі вякоў на памяці.

Звычайна я не зайздрошчу чужому мужу, чужому дому, не пускаю душу далей чужога парогу, а тут... Я не пасьпела: сэрца апярэдзіла, боўтнула пад ногі... Падышоўшы да дзьвярэй, я першы раз салодка здрадзіла свайму лёсу, які паважаю.

Хаджу, разглядаюся, падыходжу да аднаго вакна, другога, трэцяга, а выдаецца, што, утрапеўшы, стаю на адным месцы, а дом сам паварочваецца, паказваючы свае краявіды: звычайныя дамы «амбарнага» тыпу, сьпінай павернутыя, шэрыя, як дзоты, хлявы вопытнай гаспадаркі навукоўцаў, вадакачкі, не прыбраная аж зь зімы сьметніца на вуліцы. І гэта ўсё, што напрацавана чалавечым жыцьцём?! І гэта ўсё будзе ўвесь час стаяць во гэтак, зьнерухомеўшы да скону, на самых тваіх зрэнках?!

— Ведаеце, а вадакачкі тыя фантастычна выглядаюць яснай ноччу, пры месяцавым сьвятле! — кажа гасьцям гаспадыня.

Мы як апамяталіся, мы ўсе рэзка мяняем накірунак погляду, весела вырашаем не выключаць поўню і ўдзень! Панурыстыя склады гаспадар перайначыў на панскія стайні. Заставалася яшчэ даведацца ў аэрапорце, на якой такой паветранай трасе стаіць гэты дом, бо час ад часу над страхой пралятаў самалёт. Іншы раз (да сьмеху кажучы) чуваць, як ляпаюць у паветры ягоныя незачыненыя дзьверцы.

Наш мозг ужо не адрозьніваў ілюзію ад рэчаіснасьці.

Дзеці разьбегліся па сваіх пакоях на другім паверсе ў розныя бакі, паселі, як на галінках расахатага дрэва радаводу. Сярэдняя Любця прыпынілася на ружовай лесьвіцы пад высокай стольлю, бы пад самым небам. Ножкі роўненька, у чырвоных пантофлях, прыбраўшыся, яна як на боскіх далонях — на сярэдняй прыступцы, скора ўжо будзе падымацца сама. Любця наагул надавала навасельлю сьвяточнасьць, была прыбраная адумысьля. Паказваючы дом, гаспадары таксама спыніліся на ружовай лесьвіцы, паселі і госьці паблізу. Гаспадар шчыльна абхапіў жонку і дачку, яны ўжо бы на каленках ягоных абедзьве. Нявялічкі, шчыры на дух, сядзіць на вы-





## ЗЬБЯРЫ КНІГАРНЮ «НАША НІВА»

Выйшла новая кніга сэрыі

# Алесь Кудрыцкі Суд на Каляды

Упершыню аўтар надрукаваўся на старонках «Нашай Нівы» ў 1997 г. Пасьля гэтага ў «НН» Алесь Кудрыцкі друкаваўся ў розных жанрах — ад дзіцячых вершыкаў да палітычнага рэпартажу. У кнігу ўвайшлі публіцыстычныя артыкулы журналіста, друкаваныя ў газэце ад 1998 г.

**Алесь Кудрыцкі. Суд на Каляды** — Вільня: Інстытут беларусістыкі, 2007. — 180 с. — (Кнігарня «Наша Ніва»).

шукайце ў кнігарнях і ў незалежных распаўсюднікаў



шэйшай прыступцы і выдаецца роўным з жонкай, і, наагул, яны роўня адно аднаму ва ўсім найлепшым. Ён заўсёды калі не ў любові, то ў шчасьлівай залежнасьці ад ейнай статнасьці, віднасьці, прыгажосьці. Ня памятаецца, каб яна калі прыхарошвалася, падбірала строі, адным словам, з плеч ды ў печ. Толькі аднойчы: «Я сёньня ішла па горадзе, прыбралася ў куртку старэйшай дачкі са стразамі, муж, чацьвёра дзяцей побач, на мяне аглядаліся нават зусім маладыя мужчыны...» — скажа сьмеючыся. Блісьне неспадзявана ў натоўпе, можа, толькі дзеля таго каб пацьвердзіць мужаў выбар, а можа, і дзеля людзей, калі накоціцца пара красоў. Паміж імі тая моцная сувязь у некалькі залатых ніцяў, як сонечных промняў. Любця сядзіць у бела-ружовым, бы птушанятка ў пуху, целка сьвеціцца. Яна яшчэ няўцямна сочыць за маці. Ручкі складзены гэтаксама, па-даросламу, па-жаноцку, старадаўнім сялянскім жэстам, калі нарэшце адкладаецца на іржышча серп, каб спыніць штодзённы, безупынны рух, суцішыць час, спыніць час — адну далонь, закальцаваную пярсьцёнкам, наверх другой. А можа, гэта жэст яшчэ ад тых часоў, калі мужчыны-качэўнікі перавяслам з духмянай саломы перавязвалі рукі любай жанчыны на вясельлі, каб ня зьбегла. Сядзіць, збачэніўшыся, скасавурыўшыся трохі, яна яшчэ не адводзіць вачэй ад бацькоў, яшчэ ў яе кароткі, блізарукі погляд на сьвет, як праз вакенца з варыўні, дзе прарастае бульба. Двухгадовыя блізьнюкі нікому не даваліся ў рукі, віравалі вакол дарослых, аж бурбалкі хадзілі, як ад карасёў па вадзе. Любця ловіць аднаго зь іх, малы на руках сьцішыўся, ашчалепіўся, яны парапляліся маладымі дрэўцамі з аднаго камля.

Любця вырасьце, адменіцца, вядома, а я заўсёды буду ўспамінаць маленькі абразок дзяцінства — дзіця на ружовай лесьвіцы.

Гаворым, якія лепей купіць шпалеры, тое-сёе, гаспадыня запрашала дызайнэра, аднаго, другога, каб нешта перарабіць, параіцца, і цяпер во гаворка зайшла пра гэта. А сама, бачу, бароніцца ад парад. Кожны дарадчык, выходзіць, бы прэтэндуе на ейнае жытло, хочучы пасяліць у доме свае мары, свае жаданьні, свой густ і выглядае нявінным захопнікам. Я сама ледзь вымкнулася наконт францускай нацяжной столі, як тут плянавалася, і хутчэй змоўкла. На мой погляд, тут пасавалі б цёмныя бэлькі, перакрыжаваньні сучаснасьці і мінуўшчыны. Ёй жа хацелася нечага надзвычайнага, каб не засталося і напамінку аб цесных сумежных пакоях — яны ж толькі што вышчаміліся з гарадзкіх шчылін. Яны яшчэ хадзілі тут, стуліўшы па звычцы плечы, рукі, баючыся тарганупца аб вуглы мэблі. Яны асьцерагаліся павысіць голас адзін на аднаго, бо дом быў куплены ў сям'і, якая разьвялася. Іх палохала разьбітая люстра ў холе, пакінутая ранейшымі гаспадарамі, жывасілам пашкоджаны кран у ваннай. Яны яшчэ хадзілі тут па друзу былога разладу.

Заляпалі дзьверы, выходзілі дзе хто каторы быў — сям'я праводзіла гасьцей. Мне, бачу, паклалі ў сумку (ну проста ў тэму!) апэльсіны, бы з свайго саду дзе-небудзь у Таскане.

Вяртаюся і не зачыняю за сабой гарадзкія вароты, як весьнічкі ў іхны апэльсінавы сад. Горад патыхне ў твар чадам, бы з гаража. У іх... вечар, думаю сабе, седзячы ў кватэры на восьмым паверсе, быццам гэта яны недзе ад мяне на другім канцы сьвету. У горадзе няма вечара, той юлёвай смугі, адчуваеш толькі вечаровую золь. Мяне, пэўна, болей ня будзе вярэдзіць бясконцы зык сьвярдзёлка наверсе ці збоку. Я разумею: чалавек захлынаецца ў сваёй кватэры-шчыліне, яму патрэбная прастора, ён няўцямна рушыць сьцяну, а можа, і маю за адным разам.

Вецер заходзіў з аднаго боку, з другога — дзьмухаў на высотнік, як на сьвечку, гасіў запозьненыя агні. Позна, чую, спыніўся ліфт на пляцоўцы, пэўна, вярнуўся, прабачыўшы маю салодкую здраду, Дамавік, запахла куравам. І раптам тэлефонны званок: «Прабач, што позна, мыю дом з раніцы да вечара, прыбіраю і ня чую стомы, проста нейкі цуд!» Голас гаспадыні са Ждановічаў набрынялы, ледзь пазнала, бы яна гаворыць са мной праз адчыненае вакно, голас нарэшце разьвіхнуўся — калі дом стаіць на зямлі, ён як звон. Яна гаварыла, гаварыла, дзівілася зь сябе, што ня ходзіць у інтэрнэт, не чытае звадлівыя дзёньнікі, само, маўляў, адпала, як пераехала. Успамінала, што гатавала бабуля ў вёсцы на сьняданак, плянуючы завесьці ў сям'і старадаўнюю завядзёнку, маўляў, дом на зямлі павінен мець глыбокую памяць, як і гаспадар.

Што да мяне, то я іншы раз, назіраючы, як ля крамы хлебазаводу вясковыя людзі нясуць у багажнік машыны ахапкам пад самае падбародзьдзе сьвежы хлеб, хацела аднаго: таксама прыехаць зь вёскі, накупляць гарачых боханаў, сесьці ў машыну і... назад, дамоў. Адламаць па дарозе скарынку пахнючую, бы зь печы, з матчыных рук, і зьесьці ані з чым.

Дом у Ждановічах доўга не адпускаў, як за руку трымаў, хоць ты кідай усё і едзь да яго бяз дай прычыны. І спраўдзілася: да іх вярнуўся ад былога гаспадара сабака — па маіх сьлядах, па маіх перадумках.

Пэўна, дом сам падбіраў сабе і гаспадароў, і сяброў, ня тое... Сабаку звалі Дамініка.

## АЛЯКСЕЙ «KUZMICH» КАЛАШУК

МОЙ ТЭРМІН

Шэсьць дзён…
Шэсьць кісельна-цягучых дзён і начэй,
Поўных павольна бягучых сэкундаў. І думка: «Хутчэй!»
Хутчэй бы… Шэсьць дзён.
Час… Гэты суровы судзьдзя кінуў мяне ў астрог.
І я сяджу на волі ў турме і смуга ў вачох.
Шэсьць дзён… Хутчэй бы…
Мне да цябе паўтары сотні гадзін.
І ў кампаніі хмельных вясёлых сяброў я адзін.
Бо мне сумаваць яшчэ шэсьць дзён.
За каханьне сьляпое мне наканаваны праклён:
З каханьнем без каханай. Аднаму. Шэсьць дзён.

## ВІНЦЭНТ

***

Скончыўся час
Ты сэрца кранi
Яно паляціць
Да таго небакраю
Дзе крыж за крыжом
Зьмяняе крыж
Дзе кожная мара
Кавалак раю

Я ў жменю сьвятло
І зямлю зьбіраю
Каб выйсьці
На шлях

## ЮЗІК ДЗЕНІСЮК

***

Калі ствараў Пан Бог сусьвет,
Спачатку было слова.
І лік у зорак і плянэт
Ён вёў якойсьці мовай.

Грузінскай — скажа вам грузін.
Габрэй — што на іўрыце...
Ня скажа беларус адзін.
Ня будзе гаварыці.

Імпэрскі прэс — прыгонны стрэс
І глузд чужы ў галовах
Вытрэпваюць з народа спрэс
Аскепкі роднай мовы.

Ды не было з пачатку дзён
Ніякіх моў ні нацый.
Лік вёў Гаўрыла-маладзён —
Арханёл-папарацы.


ЮЛІЯ ДАРАШКЕВІЧ

**Удзельнікі ўсеэўрапейскай канфэрэнцыі каталіцкіх біскупаў, што прайшла ў Менску, сустракаюцца зь мітрапалітам Філарэтам.**

# 06




**N.R.M., 2007**

N.R.M. нібы разьвітваецца са слухачамі.

Новы альбом галоўных беларускіх рок-герояў, які зьявіўся пасьля пяцігадовага маўчаньня. Гэты дыск варта паслухаць хаця б дзеля адной песьні — «Менск і Мінск». Вольскі — майстра кранальных балядаў. Недзе раз на пяць год яму ўдаецца напісаць ня проста песьню-крычалку, а сапраўдны рок-гімн, які можа скарыць кожнага, незалежна ад узросту і музычных прыхільнасьцяў. «Менск» выдатна ўпісваецца ў лягічны шэраг: «Бывай» — «Паветраны шар» — «Маё пакаленьне». Гэтым дыскам N.R.M. нібы падсумоўвае 13-гадовую кар’еру. «Ніколі» адсылае нас да «Дому культуры», «Сталінград» да «Трох чарапахаў», «Свабоды глыток» да «Пашпарту», а «Гімн рок-н-рольшчыка» (10) наагул да «мроеўскіх» часоў. Песьня пра бел-чырвона-белую лодку сымбалізуе апошні па часе этап разьвіцьця, калі няпроста вызначыць — N.R.M. гэта, ZET ці то «Крамбамбуля». У кожнай другой песьні сустракаем музычнае самацытаваньне, што ня можа ня сьведчыць пра крызыс у гурце. Некаторыя песьні падаюцца надта ўжо высмактанымі з пальца. У адрозьненьне ад пералічаных ранейшых альбомаў, гэты не адбудаваны канцэптуальна: «06» проста выглядае на складанку песень апошніх год розных па настрою, тэматыцы. У адной песьні Вольскі раве: «Пайшоў на фіг, сука», — у другой хор дзетак выводзіць: «Мама, тата, я люблю неба, сонца і зямлю». Зь сюрпрызаў альбому — нарэшце далі засьпяваць аўтару шматлікіх «энэрэмаўскіх» гітоў — бубначу Алезісу Дземідовічу, які выдаючы на зацятага панка хрыплаватым голасам зацягвае: «Уеду я ў Кітай, у паднябёсны рай». Жыцьцесьцьвярджальных песень на дыску нямала, але за дзяжурнымі фразамі пра тое, што «усё роўна мы пераможам», крыецца нейкая туга. Падаецца, што настрой альбому вызначае якраз не «Гадзючнік», а «Толькі для цябе», у якой N.R.M. нібы разьвітваецца са слухачамі.

# Кіно




**beZ bileta, West Records, 2007**

«Я — ромашка, я — ромашка, порвалась моя тельняшка»

Адна з самых яркіх беларускіх камандаў пачатку новага стагодьдзя канчаткова пазбавілася фолк-рокавага налёту і паклала ў кут прымочку для электрагітары, каб запісаць ціхенькі поп-альбом. Сёньня «beZ bileta» — цалкам расейскамоўны поп-рок праект, стыль якога вызначае песьня з гэтага дыску пад назвай «Такія павольныя»: альбом — цягучы, настрой — лірычны, песьні — пранізаныя «трагічнымі» клявішнымі. Зрэшты, не паўсюль пяецца пра дажджы, сны, мары і аватары. У «Песьні Артыста» Віталік іранізуе зь сябе: «За апошнія паўгоду нефігова апапсеў, калі такую фігню запеў». Фігня — не фігня, але песьні гэтыя — на рэдкага аматара. Яны на першы погляд немудрагелістыя, але пры гэтым перапоўненыя вобразамі, які ня кожны здольны ўспрыняць. Вам, да прыкладу, падабаецца такая «мантра»: «Я — ромашка, я — ромашка, порвалась моя тельняшка»? У «Кіно» сумяшчаюцца два пачаткі Віталіка — абыякавага да ўсяго блазна і тонкага лірыка, які здольны напісаць сапраўдную пачуцьцёвую песьню («Месца для цябе» якраз з такіх). Некаторыя творы можна скарыстаць для музычнага аздабленьня якога студэнцкага сэрыялу. Ад астатніх беларускіх поп-рок праектаў «beZ bileta» розьніць большая тэкставая заглыбленасьць — штампаў і агульшчыны ў іх значна меней. У літоўцаў — Мамантавас, у расейцаў — Барзоў, а ў нас няхай будзе Віталік Артыст.

# Urbanoid




**Atlantica, West Records, 2007**

«Atlantica» перастала нагадваць «Modern Tolking».

Другі поўнафарматны альбом ад самага пасьпяховага ангельскамоўнага праекту зь Беларусі. Адаслаўшы другога вакаліста рэклямаваць «Вэлкам», прадусары запрасілі двух новых удзельнікаў, у выніку «Atlantica» перастала нагадваць «Modern Tolking». Іх альбом гучыць досыць прыстойна. Апакаліптычны пачатак пераходзіць у цудоўную гітарную баляду «Flowers» (грае Сяргей Анцішын). Загалоўная «Urbanoid» з прэтэнзіяй на ўзорны электра-поп. Яны зусім не глядзяць у бок Расеі, аўтарытэты для іх, відаць з усяго, Дэвід Боўі пачатку 80-х, Kraftwerk, піянэр тэхна DJ Bobo і, натуральна, «дэпешы».

Звычайна, калі беларускія поп-артысты бяруцца за стварэньне ангельскамоўных гітоў, выходзіць зусім ужо ніякавата: «беларускасьць» выдаюць найперш пустыя безгустоўныя аранжыроўкі. «Atlantica» пазыцыянуе сябе па-за заімшэлай беларускай эстрадай і ўсімі сіламі намагаецца паказаць сваю «эўрапейскасьць» (зводзілі матэрыял на ангельскай студыі). Няхай не заўжды атрымліваецца — шэраваты голас вакаліста і тупаваты біт у некаторых трэках надта ўжо напружваюць, але ёсьць і цікавыя прыдумкі (як французская вэрсія «Alpha et Omega»). «Atlantica» выконвае поп-музыку для заможных і адукаваных, але не для сьвядомых і прасунутых.

**Сяргей Будкін**

# Пілігрымка ў Будслаў




ЮЛІЯ ДАРАШКЕВІЧ

**27 чэрвеня зь Менску ў Будслаў, у Нацыянальны санктуарый Маці Божай Будслаўскай**, выпраўляюцца пілігрымы.

Усім ахвотным узяць удзел **трэба запісацца ў закрыстыі Катэдральнага касьцёлу** (пл.Свабоды, 9).

Унёсак удзельніка на арганізацыйныя выдаткі — 15 тыс. рублёў.

**Арганізацыйная сустрэча зь пілігрымамі адбудзецца 24 чэрвеня ў Катэдры пасьля сьвятой Імшы а 18.30.**

## Што будзе ў Будзе

Праграма фэсту

**1 ліпеня**
**Ад 14.00** — сустрэча і прывітаньне пілігрымаў
**16.00** — сустрэча міжнароднай воднай пілігрымкі і гістарычнага крыжа.
**17.00** — сьв. Імша (служаць айцы бэрнардыны).
**18.00** — сьв. Імша для пілігрымаў зь Віцебскай дыяцэзіі (служыць біскуп Казімір Вялікаселец; сьпеў — пілігрымы).
**20.00** — сьв. Імша для пілігрымаў зь Менска-Магілёўскай архідыяцэзіі (сьпеў — пілігрымы).
**22.00** — Нешпары пра Найсьвяцейшую Панну Марыю
**23.00** — Акафіст Найсьвяцейшай Паньне Марыі (сьпеў — хор Грэка-Каталіцкай Царквы).

**2 ліпеня**
**0.00** — працэсія са сьвечкамі і ўрачыстая сьв. Імша (служыць біскуп Уладзіслаў Блін; сьпеў — хор «Залатая Горка»).
**Ад 2.00** — моладзевае малітоўнае чуваньне (пляц перад базылікай).
**2.00** — Боская літургія паводле ўсходняга абраду (перад абразом Маці Божай).
**4.00** — адарацыя Найсьвяцейшага Сакрамэнту (у базыліцы).
**5.30** — «Гадзінкі» да Маці Божай.
**6.00** — сьв.Імша (перад абразом Маці Божай).
**7.00** — сьвяты Ружанец.
**8.00** — сьв. Імша (служаць новапрэзьбітары; сьпеў — хор «Polonez»).
**10.30** — выстаўленьне Найсьвяцейшага Сакрамэнту, літанія да Маці Божай, працэсія, багаслаўленьне Найсьвяцейшым Сакрамэнтам.
**12.00** — урачыстая сьв.Імша (служаць каталіцкія біскупы Беларусі разам з Апостальскім Нунцыем арцыбіскупам Марцінам Відавічам; сьпеў — хор «Gloria»). На заканчэньне Імшы — гімн Te Deum.

Інфармацыю пра Санктуарый Маці Божай Будслаўскай можна знайсьці на старонцы http://budslau.catholic.by

Т.: (01797) 3-13-73,
e-mail: budslau@catholic.by
http://www.catholic.by

## ІМПРЭЗА

**Беларускі фэстываль у ЗША**

Беларуская праваслаўная царква Сьв.Эўфрасіньні Полацкай у Саўт Рыверы, Нью Джэрсі, запрашае на сьвяткаваньне паводле беларускіх традыцыяў. **23 чэрвеня** парафіяльны камітэт ладзіць восьмы Беларускі Фэстываль. **Імпрэза будзе праходзіць ад 11-й гадзіны раніцы да 8-й вечара ў царкоўным парку і залі.**

Будуць гучаць беларускія мэлёдыі і прадавацца сувэніры. Кожны здолее пакаштаваць смачных страваў. **Фэстываль адбудзецца ня гледзячы на надвор'е** — «Ці сонца, ці дождж!»

## КАНЦЭРТ

**«Жыгімонт Ваза»**

**26 чэрвеня ў менскім клюбе «Стэп»** (вул. Прытыцкага, 62) заграе гурт «юygimont VAZA». Чакаецца таксама ўдзел гуртоў :B:N:, Indra, S.D.M.

Даведкі праз тэлефоны: 649-08-88, 766-24-25

# Купальле



PHOTO.BYMEDIA.NET

### ...над Нёмнам

**30 чэрвеня** «Рух «За Свабоду» ладзіць **непадалёк ад Горадні** традыцыйнае беларускае Купальле. Даведкі па т.: (029) 133–87–17 (Эдуард), (029) 788–31–63 (Андрэй), zasvabodu.hrodna@gmail.com.

### ...у Ляўках

**У ноч з 7 на 8 ліпеня ў Купалаўскіх мясьцінах на Аршаншчыне** пройдзе **ноч вольнай беларускай паэзіі**. Вершы, песьні, проза і дыскусіі — ля вогнішча на беразе Дняпра побач з музэем у Ляўках.

### ...у «Рэактары»

**25 чэрвеня ў клюбе «Рэактар»** (В. Харужай, 29) адбудзецца 1-ы міжнародны купальскі паганфольк фэст «Купальскае Кола». Бяруць удзел ТІНЬ СОНЬЦЯ з Украіны, ALKONOST з Расеі, ZNICH, LITVINTROLL, ЛЮТОВЕРЬЕ, ПЯРЭВАРАТЕНЬ зь Беларусі. **Пачатак а 18-й.**

### ...з Ірынай Дарафеевай

**22 чэрвеня ў Мірскім замку** пачнецца трохдзённы фэстываль. У першы вечар будзе гучаць клясычная музыка ад аркестру Тэатру опэры. Пасьля гэтага выступіць ансамбаль «Верасы» ва ўсіх сваіх складах розных часоў.

**23 чэрвеня** музычная імпрэза распачнецца канцэртам «Харошак», пазьней будзе «Дыскатэка — 80-х».

**24 чэрвеня** — «Песьні году Беларусі». Імёны ўдзельнікаў вызначаюцца паводле рэйтынгаў FM-станцый.

Ну, і ўрэшце — шоў «Купальле Ірыны Дарафеевай. Фэстываль стыхій».

**Пачатак канцэртаў — а 21.30 і 23.30.**

### ...у Лёндане

Сьвяткаваньне Купальля **ў Лёндане адбудзецца ў суботу 23 чэрвеня**. **Пачнецца а 17-й у капліцы Сьв. Пятра і Паўла** (на рагу Holden Road і Holden Avenue), **і працягнецца а 17.30 у садзе Беларускага культурнага і рэлігійнага цэнтру** (39 Holden Road, London N12). Чакаюцца песьні, скокі праз вогнішча і іншыя традыцыйныя імпрэзы і дзеі.

Усе ўнёскі ў выглядзе ежы (салатаў, мяса ці то выпечкі і інш.) і пітва вітаюцца. А таксама кветкі для купальскіх вянкоў. **Вечар закончыцца прыкладна а 22-й.**

### ...у ЗША

**Нью-Ёрскія беларусы будуць сьвяткаваць Купальле 22—24 чэрвеня на тэрыторыі Ward Pound Ridge ў Cross River, NY.** Транспарт: Цягніком са станцыі Grand Central да прыпынку Katonah. Гэта прыкладна гадзіна язды цягніком ад Мангэтану на Metro North, Harlem Line.

Кантакты: Пётра і Алена Рыжыя: LenaBelarus@aol.com

### ...у Вэнтспілсе

**У Вэнтспілсе** (Латвія) **з 30 чэрвеня да 1 ліпеня** — Дні беларускай культуры. Тэматыка Дзён — «Ад Ліга да Купалы», галоўная мэта — пазнаёміць жыхароў і гасьцей Вэнтспілсу з найпрыгажэйшымі традыцыямі сьвяткаваньня Купальля ў беларусаў. Гасьцям, апрача ўдзелу ў Купальных гуляньнях, якія адбудуцца **1 ліпеня ў Прыморскім Музэі**, прапануецца даць асобны канцэрт на адной з адкрытых пляцовак Вэнтспілсу **ў суботу, 30 чэрвеня**.

## КІНАФАРМАТ «4х4»

# Азіяцкая эротыка, брытанская камэдыя і расейская прыпавесьць

**Час** (Shi gan / Time)
Паўднёвая Карэя — Японія, 2006, каляровы, 97 хв.
**Рэжысэр:** Кім Кі Дук
**Ролі выконваюць:** Юнг-Ву Ха, Джы Юн Парк, Ёнг-Хва Се
**Жанр:** Мэдытатыўная мэлядрама
**Адзнака:** 6 (з 10)

Каб не згубіць свайго хлопца, раўнівая гераіня робіць плястычную апэрацыю. Але цяпер паміж ёю і любым стаіць… яна сама, якой была да апэрацыі.

Клясычная мэлядрама патрабуе, каб былі закаханыя героі — і былі мярзотнікі, якія ствараюць палюбоўнікам перашкоды. Але, калі сацыяльныя бар'еры руйнуюцца, нягоднікі гінуць, нароўнасьць касуецца, то адну перашкоду аніводнай закаханай пары абмінуць немагчыма. Гэтая перашкода — час. Пакрысе пачуцьці сьцішваюцца, каханьне вязьне ў побыце, а твар любай — надакучвае.

Гераіня «Часу» радыкальна вырашае гэтую праблему — пад нажом плястычнага хірурга. Але страхі толькі нарастаюць, і рэўнасьць становіцца невыноснай.

**Не хачу спаць адна** (Hei yan quan)
Тайвань — Кітай — Францыя — Малайзія, 2006, каляровы, 115 хв.
**Рэжысэр:** Цай Мін-Лянь
**Ролі выконваюць:** Кан Шэн Лі, Норман Атун, Шыан-Чун Чэн, Перла Чуа
**Жанр:** Драма

Кітайскага бяздомнага абрабавалі й зьбілі. Працоўныя з Банглядэш пашкадавалі яго, забралі дадому. Пакуль герой у коме, жанчына абмывае яго — і сьпіць побач. Да адмысловага любоўнага трохкутніка: жонка, муж, хворы — далучаецца яшчэ адна гераіня і яшчэ адзін хворы…

Тайскі рэжысэр Цай Мін-Лянь, які правакаваў публіку артпарнаграфічным «Капрызным воблакам» (прыз Бэрлінскага кінафэсту) — любіць рызыкоўныя тэмы й няспешліва-прагную атмасфэру кадру. Карціна — для асобных гледачоў.

**Трыстрам Шэндзі: гісторыя пеўніка й бычка** (A Cock and Bull Story)
Вялікабрытанія, 2007, каляровы, 94 хв.
**Рэжысэр:** Майкл Уінтэрботам
**Ролі выконваюць:** Стыў Куган, Роб Брайдан, Кілі Гоўіз, Шырлі Гэндэрсан, Рэйманд Уорынг
**Жанр:** Камэдыя

Трыстрам Шэндзі распавядае пра сваё жыцьцё, але ягоны расповед увесь час удакладняецца сваякамі й знаёмымі. Дый асыстэнт рэжысэра абвяшчае пра канец працоўнага дня…

Рэжысэр Уінтэрботам адштурхоўваецца ад кнігі Лоўрэнса Стэрна, але ў яго рэжысуры клясычны раман выхаваньня становіцца камэдыяй…

**Маяк**
Расея, 2006, каляровы, 80 хв.
**Рэжысэрка:** Марыя Саакян
**Ролі выконваюць:** Міхаіл Багдасараў, Сафіко Чыаўрэлі, Сос Саркісян, Сяргей Даніэлян
**Жанр:** Драма-прыпавесьць

Лена нарадзілася ў каўкаскім гарадку, а шчасьця паехала шукаць у Маскву. Але дома распачалася вайна — і Лена вярнулася, каб дапамагчы бабулі зьдзядулем. Гераіня трапіла ў пастку: цягнікі ня ходзяць, выехаць немагчыма. Застаецца вяртацца да сябе самой…

Фільмы кінафармату дэманструюцца з 21 да 24 чэрвеня ў кінатэатрах: «Аўрора», «Мір», «Цэнтральны», «Перамога».

**Андрэй Расінскі**

# лІтаратурНы сшытак «НН»

чэрвень 2007

Сьцяпан Дзін–Дзілевіч. «Купальле» ..... 22
Юры Юркавец. «Сусьветны вулей, альбо Ўводзіны ў кансьпіралёгію» ..... 24
Уладзімер Някляеў. «Знакі прыпынку» ..... 25
Марыя Вайцяшонак. «Навасельле ў Ждановічах» ..... 26

## год паэзіі

Аляксей «Kuzmich» Калашук. Мой тэрмін ..... 28
Вінцэнт. «Скончыўся час…» ..... 28
Юзік Дзенісюк. «Калі ствараў Пан Бог сусьвет…» ..... 28

## «НН» СТО ГАДОЎ З ВАМІ

Што вы, хлопцы, пахмурнелі,
Як каго вы пахавалі?
Ці няшчасьця вас здалелі,
Ці вас думкі спанавалі?

Плюньце, хлопцы! Засьпявайма,
Аж каб вокны задрыжалі!
Ва ўсе грудзі загрукайма,
Каб усе думкі паўцякалі!

Ці ж мы будзем вечна гнуцца,
Апускаць у нядолі рукі?
Няхай сьлёзы больш ня льюцца!
Няхай нас ня знаюць мукі!

За работу жыва, жыва!
Каб нас доля не кідала,
Каб ня сохла наша ніва,
Каб нуда нас не чапала.

**Якуб Колас**
**«Наша Ніва». №24. 1907**




# А ты падпішыся!

**Каб рэгулярна атрымліваць «Нашу Ніву»,** проста паведаміце ў Рэдакцыю свой адрас. Адначасова Рэдакцыя зьвяртаецца з просьбай ахвяраваць на выданьне. Дэталі — **старонка 17.**

## ПРЫВАТНЫЯ АБВЕСТКІ

### ШПАЦЫРЫ

**А 18 гадзіне** шточчацьвер у Віцебску беларускамоўныя шпацыры ў навакольлі Дабравешчанскай царквы. Калі ласка, шпацыруйце на здароўе ды гаварыце па–беларуску, колькі душа просіць!

### КАНТАКТЫ

**Сабака-Балабака**, трымайся, дыхай, вер. Любоў мацнейшая за роспач. Молімся за цябе Твае сябры

### КНІГІ

**Прапаную** кнігі: Ткачоў «Замкі і людзі», Ластоўскі «Кароткая гісторыя Беларусі», Гуревич «Древний Новогрудок», «Беларускі кнігазбор»: Каліноўскі, Гётэ, Жылка, Міцкевіч, Летапісы, хронікі, Баршчэўскі, Ажэшка, Ельскі, Пяткевіч ды іншае. Т.: 753–70–05

**Абмен** культуралягічнай інфармацыяй, кнігамі. Дашлю сьпіс прапаноў. Канфэрэнцыі, літаратурныя вечарыны, выдавецкія праекты. Ад Вас — капэрта са зваротным адрасам. а/с 195, 220030, Менск. alesknigi@mail.ru

### ПРАЦА

**Якасна выканаю** пісьмовыя працы па беларускай гісторыі, літаратуры, мове. Зьвяртацца загадзя. Т.: (029) 101–03–24. Юрась.

**Якасны набор**, рэдагаваньне тэкстаў на беларускай мове. Зьвяртацца загадзя. Т.: (029) 101–03–24. Юрась

**Дзяўчына-філялягіня** шукае любую працу, зьвязаную з тэкстамі. Вялікі вопыт працы. Т.: 174–98–91

### ТАМАДА

**24 жніўня** адбудзецца вясельле з нагоды шлюбу. Патрэбны добры тамада. Разгледзім усе прапановы. Т.: 307–22–15 (Арцём), 119–84–66 (Ірына)

### ПАКОЙ

**Дзьве дзяўчыны** здымуць пакой у Менску. Т.:(029)798–03–42. Наталя

### СЯБРОЎСКІЯ ПАДАРОЖЖЫ

**Зьміцер Касьпяровіч запрашае** ў падарожжа 22 — 25 чэрвеня: Львоў і замкі. 13 — 16 ліпеня: Грунвальд–Мальбарк–Гданьск. Т.: 292–54–58; 622–57–20; 509–12–16

## У НУМАРЫ

**Пілігрымка ў Будслаў**



Стартуе 27 чэрвеня ад Катэдры... **Старонка 30.**



**Купальская афіша**

Ад Нёмна да Мангэтана. Старонка 31.

**Наша Ніва**
незалежная газэта

заснаваная ў 1906, адноўленая ў 1991
**галоўныя рэдактары «Нашай Нівы»:**
З.Вольскі (1906), А.Уласаў (1906—1914), Янка Купала (1914—1915), А.Луцкевіч, У.Знамяроўскі (1920), С.Дубавец (1991—2000).

сакратарка рэдакцыі — Наста Бакшанская
шэф–рэдактар — Андрэй Дынько
галоўны рэдактар — Андрэй Скурко
мастацкі рэдактар — Сяргей Харэўскі
заснавальнік — Мясцовы фонд выданьня газэты «Наша ніва»
выдавец — Прыватнае прадпрыемства «Суродзічы»

**АДРАС ДЛЯ ДОПІСАЎ:**
**220050, Менск, а/с 537**
**Tel/fax: (017) 284-73-29, 8-029-613-32-32, 8-029-707-73-29.**
**E-mail: nn@nn.by**
**On-line: www.nn.by**

© **НАША НІВА**. Спасылка на «Нашу Ніву» абавязковая. 12 палос фарматам А2, 6 друк. арк. Друкарня РУП «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». Менск, пр. Ф.Скарыны, 79. Рэдакцыя не нясе адказнасьці за зьмест рэклямных абвестак. Кошт свабодны. Пасьведчаньне аб рэгістрацыі пэрыядычнага выданьня №581 ад 4 ліпеня 2002 г., выдадзенае Міністэрствам інфармацыі Рэспублікі Беларусь. Юрыдычны адрас: 220101, г. Менск, пр. Ракасоўскага, 102–71. Р/р 3012206280014 у МГД ААТ «Белінвестбанк», Менск, код 764.

Наклад 2239. Газэта выдаецца 48 разоў на год.
Нумар падпісаны ў друк 23.00 20.06.2007.
Замова № 3367.
Рэдакцыйны адрас: Ракасоўскага, 102–71.